Что на них ответить? "Смерть превращает жизнь в судьбу", это сказал мудрый Андре Моруа. Кончина Ирины Козулиной показала: ее судьба состояла в том, чтобы быть и умереть достойной женой достойного политика. Поэтому нет ничего странного и кощунственного в том, что последний акт ее жизненной драмы, связанный со смертью и похоронами, окрашен в политические тона. И потом, не будь этой траурной акции с политическим оттенком, власти вряд ли предоставили бы Александру Козулину трехдневный отпуск для участия в похоронах.

Светлая и вечная память Ирине Ивановне Козулиной!

Вячеслав ОРГИШ.

Апавяданне Марыі Вайцяшонак, прысвечанае Ірыне Казулінай, было надрукавана ў "Нашай Ніве" №6 (508). Толькі яна не хацела, каб справа дайшла да мужа, каб турэмшчыкі выкарысталі гэта, каб прымусіць мужа адрачыся ад ягоных прынцыпаў. Магічны збег абставін: апавяданне пабачыла свет роўненька год таму, 23 лютага 2007 года…

Загад каралевы,

або Пяць хвілін у парозе

Што гэта за Новы год? Не было сьнегу — адныя восеньскія мыдліны. Усе чакалі сьвята, а зямля яшчэ не была перасланая з будзённага на сьвяточнае. І трэба было самой рупіцца, ствараць таямніцу, штовечар па зорах запальваць сямісьвечнік, здумляць, што паставіць на стол.

Вецер з ракі, чайкі раз-пораз падымаюцца над вадой, над дробным рабаціньнем, белай пенай вышэй і вышэй да высокай хвалі. Прыбой ужо б'ецца аб сьцяну. Наш белы дом на самым беразе выдаецца прагулачным параходам — з пакояў кватэры я бачу толькі ваду і той бераг. Месяц блісьне з-за хмар срэбнай лускай, як шчупак на нерасьце, абдасьць пырскамі. Я дзіўлюся, што ў нас, у людзей, якія жывуць каля вады, ані ў кога няма прыватнага чаўна.

І толькі за некалькі дзён да Новага году позна ўвечары пайшоў сьнег, буйны, кожная сьняжынка асобнай выцінанкай, хоць ты яго ў кошык зьбірай, як зімовыя кветкі, і нясі пацешыцца дамоў. І ў гэты момант нехта распачаў салют! Сярод сьнегу расьцьвіталі рознакаляровыя пэтарды. Вядома ж, выпадковае супадзеньне.

Стоячы ў вакне, я мроіла, што жыву ў каралеўстве (у якім такім веку, на якім такім сьвеце), дзе загадана вітаць першы сьнег, смалячы з гармат.

Было пераслана з будзённага толькі на адну ноч, але гэтага быццам і дастаткова, каб засьпяшацца накупляць падарункаў. Тым больш што ў касьцёлах ужо прагучала сакральнае: "Перадайце бліжняму знак супакою..." І я, накінуўшы нешта на плечы, абы з дому, захапіўшы цукеркі, пайшла да Аляксандры — гэта спусьціцца з майго паверху крыху ніжэй. Мы мала знаёмыя, але часта біярытмы нашыя супадалі, і мы сустракаліся ў пад'езьдзе, у ліфце, ня болей. Іншы раз яна была з дарослым і дочкамі, усе трое звычайна надэчыўшыся да астатняга. Выдавалася, яны райскімі птушкамі зьляталі праз ноч з залатога шаста і толькі за дзьвярыма пераўвасабляліся ў маладых жанчын зь Зялёнага мысу (на высокіх абцасах, у нечым рознакаляровым, толькі што пер'е ня ветрае на галовах), якіх поўны наш горад. Ня мой фармат, як той казаў. Але ейны заўсёдны настрой, непасрэдная весялосьць змушвалі радасна адазвацца, усьцешыцца чужому балю-маскараду.

Цяпер усе ведалі: муж Аляксандры — палітычны вязень, у калёніі на некалькі год. Я ж сама ня маю аніякіх такіх амбіцый: не выходжу на плошчу, не вывешваю сьцягу на бальконе. Нядаўна, едучы ў таксоўцы, убачыла бел-чырвона-белы маленькі сьцяжок у салёне. "Гэта... польскі?" — запыталася ў маладога кіроўцы, не даючы веры сваім вачам. Гэта ж сярод белага дня! У цэнтры гораду! І таксоўка не бранявік! "Амаль усе мае пасажыры таксама блытаюцца", — адказаў ён засмучона. Сапраўды, мяне хвалююць, прываблліваюць выступы рэвалюцыйныя гэтак сама, як водар кветак дзікіх, занесенных ветрам у горад, як пах парфумы GUCCI: нешта вясновае — ландыш, фрэзія, дубовы мох і найболей — нарцыс. Я ішла да Аляксандры проста як да суседкі ў бядзе, каб перадаць знак супакою, дакрануцца да яе, бы стоячы ў касьцёле падчас службы.

Адчыніла сама Аляксандра. Голас яе ціхі, глухі, бы здалёк, з суседняга пакою, хоць стаяла побач — голас бяды, высахлае моўнае рэчышча. І толькі гэта падалося нязвыклым. А навокал буяла паўночнае зьзяньне — ейны заўсёдны космас. Усе праёмы дзьвярэй ва ўсіх пакоях у зыркіх гірляндах сьвяточных агнёў. Пазначаныя ўсе хады, як у суцэльнай цемры днём і ноччу, у якой яна цяпер, вядома, сябе адчувала. Гэта быццам сполахі памяці, калі ўсё зруйнавана, зьнішчаны дом, але недзе вось тут павінны быць дзьверы, і тут, і тут таксама. І не зачэпіш у гэтым доме па памяці плячом вушака, і не абапрэсься на яго. Аніводнага цёмнага кута ў пакоях, аніводнага, каб сумнага. Елка відаецца з парога, прыбрана густа, вясёлкавым і сумётамі, як сьнегападам у непагадзь. Елка вялікая, з шырокім нізам, як прыполам, дзеля яе, пэўна, адчыненыя падвойныя дзьверы ў зале. Аляксандра ў белай блюзцы. Яны абедзьве разам ходзяць, прыбраўшыся, па сьветлых пакоях, разам няўцямна паглядаюць у вакно, як... з маяка. Я ня здолела схаваць зьдзіўленьня, жалю, аглядаючыся, усё бачу скрозь свае стаячыя, стрыманыя сьлёзы, як праз ілюмінатары. "У нас так, як заўсёды, як Ён любіў..." — кажа Аляксандра. Глядзела на мяне здалёк, з тысячагодзьдзяў, калі жанчына ў непагадзь разводзіла выратавальнае вогнішча на беразе мора, каб пазначыць дарогу вяртаньня, дарогу дамоў.

Пяць хвілін у парозе, і я сьпяшаюся разьвітацца, у мяне сеў голас, падлога хістаецца пад нагамі, падымаюся да сябе ўжо, бы ў верхнюю каюту, успамінаючы: на сваіх выступах ейны муж любіў паўтараць "Я — марскі пехацінец".

Пяць хвілін у парозе, і я адмаўляюся ад звычкі разумець каханьне як нешта інтымнае, асобнае, што тычыцца толькі дваіх, закаханых адно ў аднаго. Любое пачуцьце, тым больш каханьне, публічная, нават грамадзкая зьява, — гэта нешта такое, што зьяўляецца разам з чалавекам. Гэта ўсхваляваны пачуцьцём сьвет, як лічыць Альфрэд Кальлерыч. І мой сьвет таксама пасьля наведваньня Аляксандры.

Пяць хвілін у парозе, адкуль праз адчыненыя насьцеж дзьверы бачныя былі ўсе пакоі, увесь наш белы дом, уся нашая старана, дзе яшчэ дзейнічалі зьявы сублімацыі старажытных рытуальных памкненьняў: арышты, астрогі. І памяркоўная згода людзей з усім, маўляў, "такі цяпер час" — абарончы рубеж сваёй абыякавасьці. Цяпер я разам з Аляксандрай намагалася трымаць у руках усе "ключы", каб не згубіць сваіх мройных уяўленьняў аб дасканаласьці боскага сьвету. Разам зь ёй вучылася не зжывацца з архетыпам параненага чалавека, што для большасьці з нас вельмі характэрна — бядуем, як у запоі, бяз дай прычыны.

У тую навагоднюю ноч я таксама спынілася каля ейнага вогнішча на беразе, спадзеючыся, што сьвятло дойдзе да тых, хто церпіць бяду або звычайную косную крыўду.

Вецер з ракі падаваў голас у выцяжцы — голас далёкіх вандровак у думках, вандровак і вяртаньняў, зноў і зноў да Аляксандры. Скончацца сьвяты, і яна здыме белую блюзку, як і елачную мішуру, выключыць сьвяточнае сьвятло. Толькі цяпер лёгка будзе знайсьці мне і кожнаму, хто яе ведае, выратавальны шлях па зорах. І здасца верагодным: каб яна была каралевай або проста жонкай прэзыдэнта, яна б загадала смаліць з гармат, калі б пайшоў доўгачаканы першы сьнег.

Хіба гэта не падзея ў нашым маленькім жыцьці — маленькім, як гэты аповед пра каханьне?

Народная Воля http://www.nv-online.info
28 ЛЮТАГА 2008 г.

КАЛІ Б Я БЫЎ ПРЭЗІДЭНТАМ...

Вярнуў бы народу свята 25 сакавіка — дзень абвяшчэння БНР

Ухваляю прапанову мінчаніна Валерыя Адула адкрыць на старонках любімай газеты "Народная воля" так патрэбную сёння рубрыку — няхай як мага болей людзей розных узростаў і прафесій выкажуць асабістыя погляды-развагі на ролю прэзідэнта ў незалежнай краіне — усім будзе карысць.

Перш-наперш я адмяніў бы ганебную забарону на друкаванне "Народнай волі" ў Мінску, вярнуў бы з "эміграцыі" і іншыя незалежныя газеты, заадно ўключыў бы іх у каталог "Белпошты", што адразу дадало б падпісчыкаў на незалежныя выданні, якія нясуць праўду нашага жыцця ў самыя глухія куткі краіны.

Абавязаў бы ўсіх чыноўнікаў знізу да самага верху здаваць экзамены на добрае веданне беларускай мовы не толькі пры залічэнні на службу (як гэта практыкуецца ў Ізраілі на абавязковае веданне іўрыта), а і ў рабочым парадку, ужо пры пасадзе, каб яны не паглядалі фанабэрыста на тых грамадзян, якія звяртаюцца да іх на роднай мове. Заадно дамогся б, каб чыноўнікі ўсіх рангаў замянялі рускамоўныя шыльдачкі на дзвярах службовых кабінетаў на беларускамоўныя — такое, памятаю, нават у нашым горадзе ўводзілася на пачатку 90-х гадоў мінулага веку ў кароткую, на жаль, пару нацыянальнага Адраджэння, якое так не ўхвалялі камуністы і манкурты розных масцей, што ўрэшце і абярнулася для краіны сумна вядомай рэформай 1995 года.

Беларусы церпяць зараз трайны прыгнёт, як пры рускім царызме і савецкім камунізме: нацыянальны, палітычны і сацыяльны. Таму, стаўшы прэзідэнтам, вырашыў бы самую ключавую, нацыянальную праблему — вярнуць родную мову ў сферу адукацыі, таму як незалежнасць роднай мовы ад чужой ёсць незалежнасць нацыянальная, палітычная і эканамічная. Ва ўсіх сённяшніх цалкам рускамоўных гарадскіх школах і каледжах перавёў бы выкладанне на беларускай мове ўсіх прадметаў у 1-8-х класах — на першым этапе, таму як ужо склаліся цяжкасці з выданнем падручнікаў на роднай мове. Каб бацькі атрымалі ўпэўненасць у тым, што беларуская мова іх дзецям спатрэбіцца пры паступленні і навучанні ў ВНУ, адкрыў бы цалкам беларускамоўны Дзяржаўны універсітэт, дзе б рыхтаваліся нацыянальныя кадры для школ, ВНУ, устаноў культуры, дашкольных дзіцячых устаноў.

Вярнуў бы ў заканадаўчае поле і грамадскі ўжытак нацыянальную гістарычную сімволіку — бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня", якія мелі дзяржаўны статус у БНР у 1918 годзе і на пачатку 90-х гадоў мінулага веку пасля атрымання нашай краінай незалежнасці.

Прыняў бы ўсе магчымыя захады, каб спыніць настойлівую русіфікацыю краіны, якая вядзе да канчатковай згубы роднай мовы, маралі, культуры, сацыяльнай дэпрэсіі, нігілізму, абыякавасці мас да ўсяго, што творыцца вакол іх. Дзеля гэтага вярнуў бы Саюзу беларускіх пісьменнікаў (а гэта больш за 400 чалавек, найболей сталая, таленавітая, нацыянальна зарыентаваная частка майстроў слова) іх даўні, з савецкіх часоў, Дом літаратара з бібліятэкай, права сустракацца пісьменнікам са сваімі чытачамі ў бібліятэках, школах, дамах культуры.

І апошняе: вярнуў бы Першаму нацыянальнаму тэлеканалу вяшчанне цалкам на беларускай мове — як было нават пры камуністах, дазволіў бы апазіцыі мець свой незалежны тэлеканал — як гэта назіраецца ў незалежнай Грузіі. Ды і астатнім тром нацыянальным тэлеканалам параіў бы не менш за 75 працэнтаў перадач весці на роднай мове. Таму як ніхто так, як сённяшняе тэлебачанне, не выбівае з людзей нацыянальны дух, самасвядомасць і гонар беларусамі звацца. Нават болей, чым усе рускамоўныя газеты, што кормяцца з дзяржаўнага бюджэту і ўхіляюцца ад вострых праблем грамадства па былым, з савецкай эпохі, рацэпце. Толькі родная мова можа спыніць працэс збяднення і фізічнага вынішчэння нашага народа.

Алесь КАРНІЦКІ,
пенсіянер,
жыхар г.Слуцка.

Запретил бы въезд в нашу страну Черномырдину, Селезневу, Строеву

Уважаемая редакция!

Прежде всего хочу полностью поддержать предложения уважаемых читателей Миколы Канаховича, Михаила Пастухова и других.

Со своей стороны хочу добавить, что бы сделал я, будучи президентом.

1.Как и предлагает Микола Канахович, вернул бы нашей стране ее историческое название.

2.Отменил бы решение о строительстве атомной станции на территории Беларуси. В конце концов ради уменьшения зависимости от России вступил бы в долю по строительству атомной станции в Летуве.

3.Запретил бы въезд в нашу страну и даже проезд через нее Черномырдину, Селезневу, Строеву.

Дмитрий РАХМАНОВ,
пенсионер.

Минск.

РЕПЛИКА

А тогда они молчали

Уважаемая редакция "Народной воли"!

Хочется поделиться с вами вот какими мыслями. На днях БТ показало сюжет о П.М.Машерове. Казалось бы, как здорово, что белорусам напоминают об их почетном соотечественнике! Мне же кажется, что подчиненные г.Зимовского не имеют на это морального права! Почему? Да потому, что в свое время они не показали белорусам по своим каналам толпы "невидимых" ветеранов, которые сами надумали переименовать проспект Машерова, не брали интервью в автобусах, трамваях, на улицах у простых граждан, что они думают об этом переименовании. Тогда БТ глухо молчало!

С уважением —

В.А.РУСЕЦКИЙ.

г.Минск.

SOS!

Я ўвесь у жалобе

Я ўвесь у жалобе,
Я трызну спраўляю,
Бо родную вёску
Сягодня хаваю.

Забітыя вокны,
Раскрытыя стрэхі,
У хатах не чутна
Дзіцячага смеху.

Не будзяць на святы
Вяселлі-гулянні,
А ледзь не штодзённа
Ідуць пахаванні.

Я ўвесь у жалобе,
Я шапку здымаю,
Бо сэрца часціну
Я з болем хаваю.

Барыс БАХАР.

г.п.Наваельня
Дзятлаўскага раёна.

ДИСКУССИЯ

Не может нормальный человек чувствовать себя комфортно, если рядом молят о спасении тонущие люди

Уважаемая Галина Семеновна!

Я прочитал Ваше письмо, напечатанное в "Народной воле". Оно оканчивается выводом, что "не вина бывших военных, что те, кто всю жизнь работал на гражданке, уйдя на пенсию, получают мизер". Но ведь никто и не обвинял бывших военных огулом. Вы опровергаете то, что никто не писал. Почему? Давайте поразмыслим.

Представим себе, что некий пароход едва держится на плаву, в трюмах полно воды, по курсу рифы. Чтобы разгрузить корабль, капитан распорядился оставить на борту только команду, а пассажиров высадить на спасательные средства. Пассажиры пересели на что кому досталось. Одни — в добротные лодки, другие — на надувные матрацы, некоторые получили спасательный круг, а иным достался только обломок доски. И вот эти последние едва держатся на плаву, пускают пузыри, а некоторые идут ко дну. Те, кто находится в лодках, ничем им помочь не могут, в лодках мест больше нет. Да и с какой стати? Ведь спасательные средства выделили по справедливости в соответствии с прежними заслугами каждого. И никто из сидящих в лодке не виноват, что не хватило на всех надежного спасения.

Это взгляд с одной стороны. А с другой... Не может нормальный человек чувствовать себя комфортно, если рядом молят о спасении тонущие люди. И хочется как-то оправдать свое благополучие. Не это ли побуждает некоторых пенсионеров опровергать то, что никто не утверждал?

Экономика Беларуси вроде корабля, а пенсии — плавательные средства. Попробуем поискать аналогию в отношении заслуг и справедливости.

Одни из нынешних пенсионеров добросовестно и с полной отдачей трудились и служили, стойко переносили трудности. Вот только уместен вопросик: кому служили? Вы написали, что Родине. Честь вам и хвала. А я помню, что в то время обычно о своей службе докладывали КПСС, лично дорогому товарищу генсеку, неутомиму, выдающемуся и прочее...

Другие все время шли поперек, бунтовали, требовали перемен, шли против власти... А теперь, выходит, каждому воздается по делам их. Сегодня тоже есть ретивые служаки, готовые выполнить любой приказ. И выполняют. Оппоненты получают сроки, их бьют на площадях, наиболее значимые вообще исчезают из жизни.

В 1968 году, когда советские войска оккупировали Чехословакию, всего семь или девять человек вышли с протестом на площадь перед Кремлем. Они спасали страну, а это значит и нашу Беларусь, от позора, а их клеймили как отщепенцев, предателей. В 1960-х годах ленинградские писатели Синявский и Даниэль понесли бремя лагеря и высылки из страны. Вот эти "другие", какую они могли заработать пенсию? Вот бывший глава нашего государства Станислав Шушкевич заработал у нынешней власти пенсию менее десяти тысяч белорусских рублей. Если госчиновник уходит на пенсию теперь, то его пенсия в сотни раз больше, чем у его предшественника. Это справедливо?

Да, градация должна быть. Но непременным должно быть условие, что выплывут все. Если пенсия меньше прожиточного минимума, как это есть сегодня, то не должно быть различий пенсий в разы.

И еще пару слов о первых. Если бы все только верно служили и не было бы неугодных, то мы бы сегодня везде имели бы статуи Сталина и "Слава КПСС" со всем сопутствующим антуражем. Власть была (и осталась) такой, что вознаграждается только верная служба ей, а не Родине. Все другие как были, так и остались лишенцами.

Разрешите спросить у вас, уважаемая Галина Семеновна: "А так ли вы уверены, что никто из бывших военных не виноват, хотя бы косвенно, в том, что мы сегодня имеем то, что имеем? Вот такую экономику и такие пенсии?

Николай Александрович ЛИПУНОВ,
строитель.

г.Бобруйск.

P.S. *Уважаемая редакция "Народной воли"! У победы всегда много авторов, но никто не хочет быть ответственным за злобные гримасы прошлого, за кровь, смерть, лишения и сегодняшнее положение вещей. "Бывшие" сегодня пишут, что никто из них не виноват ни в чем. Этакие ангелочки во плоти!*

НУ І НУ!

Мінчанін Уладзімір Івашкевіч выцягваў 10-кілаграмовага шчупака паўгадзіны

На мінулым тыдні мінчанін Уладзімір ІВАШКЕВІЧ выцягнуў на Мінскім моры метровага шчупака вагой у 10 кілаграмаў.

Уладзімір Міхайлавіч працуе адміністратарам у ЗАТ "Матэна". У вольны час любіць палавіць рыбку, так бы мовіць, рыбак са стажам. Даводзілася яму летам на спінінг таксама выцягваць 10-кілаграмовага шчупака на Нарачы, але каб зімой на Мінскім моры!..

— Лавіў на жыўца, на "стаўку", — распавядае ён. — "Стаўка" спрацавала, пачаў выцягваць, але ж куды там?! Шчупак пайшоў на глыбіню, і давялося недзе з паўгадзіны валтузіць яго, каб падвесці бліжэй да лункі. А пасля гляджу — у лунку галава зайшла, а тулава рыбіны не пралазіць. Я дротам "забагрыў" за жабры, пачаў клікаць рыбакоў-суседзяў. Тыя прыбеглі, разбурылі яшчэ дзве лункі, і толькі тады мы выцягнулі шчупака на лёд. Сабраўся, я вам скажу, народ з усяго Мінскага мора. А калі прыехаў дадому і памераў рыбку, то аказалася, што ў даўжыню шчупак — 98 сантыметраў, а вагой — амаль у дзесяць кілаграмаў. Акрамя таго, з рыбіны дастаў 2 кілаграмы ікры. Да 1 ж сакавіка, дарэчы, лавіць не забаронена.

Цікава, што паехаў Уладзімір Івашкевіч на рыбалку на наступны дзень пасля свайго 55-гадовага юбілею. І зрабіў сабе такі вось падарунак. Мы таксама віншуем Уладзіміра Міхайлавіча і з юбілеем і з уловам! Як кажуць, дай Бог не апошні.

Алесь СІВЫ.
Фота аўтара.

УВАГА!

Дапаможам!

МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" аб'явіла збор сродкаў на кнігу "Васіль Быкаў. Гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах", складальнікам якой выступае журналіст Сяргей Шапран. Гэтая кніга ўпершыню падрабязна расказвае пра жыццё, творчасць Васіля Быкава. Аўтар не пакінуў па-за ўвагай таксама грамадскую і палітычную дзейнасць пісьменніка.

Кіраўніцтва "Бацькаўшчыны" просіць усіх, для каго неабыякавы лёс, жыццё і смерць Васіля Быкава, звяртацца па тэлефонах: **+375 29 6320092** (Алена Макоўская) альбо **+375 29 6258378** (Ніна Шыдлоўская).

ПРАПАНОВА

А што ж мы маем у Мінску і па ўсёй Беларусі?

Дарагая рэдакцыя "Народнай волі"!

Даўно вам не пісаў. Але сёння вырашыў адгукнуцца на паведамленне аб тым, што ў сталіцы Казахстана Астане гарадскія ўлады прынялі рашэнне аб перайменаванні 155 вуліц, якія насілі савецкія назвы. Ведаю таксама, што прыблізна столькі ж вуліц з савецкімі назвамі былі перайменаваны і ў Маскве яшчэ ў першай палове 1990-х гадоў. А што ж мы маем у Мінску ды і па ўсёй Беларусі?

Куды ні кінь — вуліцы Свярдлова, Куйбышава, Дзяржынскага, Калініна, Войкава, Валадарскага, Кнорына... Што ўжо тут казаць пра Маркса—Энгельса—Леніна?! Ці не час і беларускаму народу ўспомніць імёны сваіх славутых дачок і сыноў?

Хачу падтрымаць рашэнне Мінгарвыканкама (якое, на вялікі жаль, не адобрыў Мінюст) аб перайменаванні вуліцы Берсана ў вуліцу Эдуарда Вайніловіча, аб прысваенні новым вуліцам у мікрараёне "Міхалова-1" іменаў нашых найславуцейшых землякоў Янкі Брыля і Льва Сапегі. Спадзяюся, што гэтыя вуліцы ўсё ж з'явяцца на карце Мінска. Цяпер пра некаторыя іншыя назвы. Прапаную перайменаваць вуліцу Леніна ў вуліцу Адама Міцкевіча, вуліцу Маркса — у Падгорную, вуліцу Камсамольскую — у Феліцыянаўскую, вуліцу Энгельса — у Дамініканскую, плошчу Мяснікова — у Пляц 25 Сакавіка, вуліцу Мяснікова — у вуліцу Глеба Менскага, вуліцу Валадарскага — у вуліцу братоў Луцкевічаў, вуліцу Крупскай — у вуліцу Валянціны Мінскай, вуліцу Розы Люксембург — у вуліцу Еўфрасінні Полацкай, вуліцу Клары Цэткін — у вуліцу Сафіі Слуцкай, вуліцу Лібкнехта — у вуліцу Генадзя Карпенкі, вуліцу Калініна і вуліцу Кнорына адпаведна ў вуліцы Рагвалода і Рагнеды, Кастрычніцкую плошчу ў Пляц Кастуся Каліноўскага, дарэчы, і станцыю "Кастрычніцкую" таксама ў станцыю "Пляц Каліноўскага", альбо проста "Каліноўская". Станцыю "Плошча Леніна" варта перайменаваць у станцыю "Плошча Незалежнасці". Вуліцу Фрунзе прапаную перайменаваць у Школьную, вуліцу Куйбышава — у вуліцу Міхала Клеафаса Агінскага, вуліцу Панамарэнкі — у вуліцу Ларысы Геніюш, вуліцу Камуністычную — у Міхайлаўскую, вуліцу Сацыялістычную — у МАЗаўскую, вуліцу Аўроўскую — у вуліцу Наталлі Арсенневай, праспект газеты "Праўда" — у праспект газеты "Народная воля", вуліцу Кастрычніцкую — у Ляхаўскую, плошчу Парыжскай Камуны — у Траецкі Пляц, вуліцу Суворава — у вуліцу Тадэвуша Касцюшкі, вуліцу Ландэра — у вуліцу Канстанціна Астрожскага, вуліцу Данілы Сердзіча — у вуліцу Васіля Быкава, вуліцу Ленінградскую — у вуліцу Вацлава Ластоўскага, вуліцу Інтэрнацыянальную — у Зборавую, вуліцу Рэвалюцыйную — у Койданаўскую, вуліцу Цімашэнкі — у вуліцу Давіда Гарадзенскага, вуліцу Артылерыстаў — у вуліцу Казіміра Семяновіча, вуліцу Беламорскую — у вуліцу Белавежскую, вуліцу Чырвонаармейскую — у вуліцу Анатоля Майсені, вуліцу Катоўскага — у вуліцу Макара Краўцова, вуліцу Арджанікідзе — у вуліцу Вітаўта Вялікага. Прапаную таксама вярнуць на карту горада праспект Францішка Скарыны і праспект Машэрава (цяперашні Пераможцаў). Цяперашні праспект Машэрава перайменаваць у праспект Варвашэні, вуліцу Варвашэні (былая Енісейская) — у вуліцу Сімяона Полацкага, вуліцы Скарыны вярнуць назву Старабарысаўскі тракт, а вуліцы Першая раённая магістраль прысвяціць імя слаўнага сына ўкраінскага народа Аляксея Бераста. Падтрымліваю таксама прапанову перайменаваць суворaўскае вучылішча ў вучылішча імя Канстанціна Астрожскага. Гэта было б данінай памяці нашаму найславуцейшаму ваяру, выдатнаму грамадскаму дзеячу.

На гэтым, бадай, і скончу. Магчыма, у кагосьці з чыноўнікаў будуць свае, больш слушныя прапановы. Ад душы жадаю вам, мае сябры, моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў у працы на карысць роднай Беларусі! Да пабачэння.

Ваш пастаянны чытач і надзейны сябар —

Сяржук ГЕРАСІМЧЫК.

СОЛИДАРНОСТЬ

Александр Павлович, я хочу Вас защитить

Уважаемая редакция!

Прочитал в №№13—14 от 31 января публикацию под рубрикой "Гучная справа" по делу заведующего вторым кардиохирургическим отделением РНПЦ "Кардиология" Александра Павловича Шкета. Из заметки узнал, что его обвиняют в мошенничестве, злоупотреблении служебным положением, неоказании помощи, получении взяток.

Я являюсь пациентом А.П.Шкета. Когда мое состояние было критическим, 25 июля 2002 года кардиобригадой под его руководством в течение 9,5 часа мне была сделана операция на сердце. Каторжный и весьма ответственный труд! Бесконечно благодарен своему спасителю за его высокий профессионализм, гуманность, человечность!

Хочу подчеркнуть, что ни одного раза я от него лично не слышал даже намека на взятку. Мне была сделана сложнейшая операция совершенно бесплатно. До сих пор мучит совесть за то, что я не отблагодарил А.П.Шкета более существенно, чем спасибо.

Я знаю, какие малые зарплаты у кардиохирургов, а ведь это элита и гордость медицины. На мой взгляд, их тяжелый, очень ответственный, высококвалифицированный труд оплачивается несопоставимо низко.

Такими золотыми головами и руками разбрасываться нельзя.

Хотел бы сказать свое слово в поддержку моего спасителя. Подскажите, пожалуйста, как это можно сделать. Готов выступить свидетелем в любой инстанции, так мне велит моя совесть.

Геннадий Алексеевич БАРАНОВ,
майор милиции в отставке, исполнявший служебные обязанности в зоне отчуждения ЧАЭС в течение 972 дней, инвалид II группы.

ОТ РЕДАКЦИИ

В суде Московского района Минска слушания по делу заведующего 2-м кардиохирургическим отделением РНПЦ "Кардиология" Александром Шкетом продолжаются.

В настоящий момент идет допрос свидетелей, заявленных со стороны обвинения. Возможно, Геннадий Алексеевич, вы тоже могли бы свидетельствовать в суде и высказать свое мнение по существу слушаемого дела. Вероятно, вам стоит связаться с хирургом А.Шкетом. Несмотря на то, что в отношении него возбуждено уголовное дело и идет суд, Александр Шкет работает и продолжает оперировать. Связаться с ним можно, позвонив во 2-е кардиохирургическое отделение центра по телефону **208-68-05**.

Уважаемый Геннадий Алексеевич, если вы внимательно следите за публикациями "Народной воли", то наверняка в одном из последних номеров газеты читали о том, что в защиту обвиняемого Александра Шкета выступили более 80 человек, среди которых — народные артисты Беларуси, лауреаты премии президента, кандидаты и доктора наук. В своем обращении, которое было передано в канцелярию Московского суда, они также обратили внимание на то, что *"здоровье нации находится в руках именно таких врачей, как А.П.Шкет. С этой точки зрения Александр Петрович — государственный человек и имеет государственную ценность"*.

Народная Воля http://www.nv-online.info
28 ЛЮТАГА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

Серж победил Левона

На выборах президента в Армении в первом туре одержал победу премьер-министр страны Серж Саркисян. Наблюдатели от ОБСЕ, в отличие от оппозиции, не указали на большие нарушения, отметили, что "президентские выборы в Армении были проведены в основном в соответствии с международными обязательствами этой страны".

Саркисян набрал 52,9% голосов, его ближайший конкурент — первый президент Армении Левон Тер-Петросян — получил поддержку 21,5% избирателей, участвовавших в голосовании. Всего на пост главы государства претендовали девять кандидатов. По данным ЦИК, явка составила около 70%.

Сторонники Тер-Петросяна отказались признать результаты официального подсчета голосов. Как передает с места событий корреспондент агентства Рейтер, от 15 тыс. до 20 тыс. из них собрались в центре Еревана и скандировали "Левон! Левон!" и "Серж, уходи!".

Представители оппозиционных кандидатов говорили, что на некоторых участках царил хаос, а кое-где избирателям вручали бюллетени, уже заполненные в пользу одного из кандидатов.

Аналитики указывали, что все претенденты на высший пост в Армении были обречены в случае победы продолжать стратегический курс на сближение с Россией. За 10 лет нахождения у власти нынешнего президента Кочаряна экономическая ситуация в стране улучшилась; уровень жизни, по мнению многих, вырос. Ожидается, что он сохранит свое влияние, однако пока не раскрывает, какую роль собирается играть после ухода с занимаемого поста.

Сержу Саркисяну 53 года. Он родился в Степанакерте — административном центре Нагорного Карабаха, который является объектом затяжного конфликта между Арменией и Азербайджаном. Он начинал свою карьеру в советские времена в комсомоле, а когда в конце 1980-х годов вспыхнул этот конфликт, он активно в него включился. В конце войны Серж Саркисян стал командиром всех карабахских сепаратистских сил. В 1993 году его нынешний соперник, а тогда — президент Армении — Левон Тер-Петросян назначил Саркисяна министром обороны.

Конфликт завершился в 1994 году соглашением о прекращении огня; Армения и Азербайджан формально остаются в состоянии войны.

Саркисян возглавлял различные армянские силовые ведомства вплоть до 1999 года, когда он подал в отставку с поста главы Министерства национальной безопасности после нападения группы боевиков на парламент страны. В следующем году Саркисян снова стал министром обороны и на этом посту оставался до марта прошлого года. Тогда Роберт Кочарян назначил его премьером.

Эксперты не ждут существенного потепления в отношениях Армении с Азербайджаном и Турцией при президенте Саркисяне. Армения и Турция не поддерживают дипломатических отношений из-за расхождений в трактовке массовых убийств этнических армян в Османской империи в годы Первой мировой войны.

ПО ВАШЕЙ ПРОСЬБЕ

Признание Косово: «за» и «против»

Уважаемая редакция! В последние дни много пишут и передают о Косово, о провозглашении им независимости. Одни уже признали эту страну, другие не собираются, говорят о случившемся, как о попрании международного права. Кто прав? Не могли бы вы привести аргументы тех и других? Чем они обосновывают свои решения?

Виталий Костин, Минск.

После окончания войны в Косово в 1999 году контроль над провинцией взял на себя Совбез ООН. Резолюцией 1244 от 10 июня 1999 года он приказал тогдашней союзной Республике Югославия вывести все силы из Косово и передать его под управление ООН. Проблема состоит в том, что хоть резолюция и призывала найти "политическое решение косовского кризиса", но в ней не оговаривалось, каковым может быть это решение.

В дальнейшем Совет Безопасности не принимал никаких резолюций, предусматривающих независимость Косово.

Аргументы «за»

В итоге ряд западных правительств утверждает, что поскольку резолюция 1244 отсылает к общим принципам, обсужденным главами МИД Большой восьмерки в преддверии ее принятия, она таким образом может служить основой признания независимости.

Среди этих принципов — указание на "обеспечение в Косово эффективного международного присутствия гражданского персонала и сил безопасности" и "политический процесс, направленный на заключение временного политического рамочного соглашения, предусматривающего значительную степень самоуправления для Косово".

Евросоюз принял документ, обосновывающий присутствие миссии ЕС в Косово. В общих чертах в документе говорится, что независимость Косово соответствует если не букве, то духу резолюции 1244.

В резолюции 1244 говорится о процессе, призванном определить окончательный статус Косово, однако возможный результат такого процесса в резолюции точно не сформулирован.

"В такой ситуации действия, имеющие целью достижение окончательного статуса, более соответствуют намерениям резолюции 1244, нежели попытки блокировать любой результат в условиях, когда все согласны, что статус-кво поддерживать нельзя", — говорится в документе ЕС.

Дается и одобрение международному признанию Косово: "В целом, если некое образование появилось в качестве государства в том виде, как это понимается международным правом, может быть принято политическое решение о его признании".

Что же касается законности миссии Евросоюза, утверждается, что ничто не мешает ЕС взять на себя задачи ООН, так как в резолюции 1244 на этот счет говорится об "эффективном международном присутствии гражданского персонала и сил безопасности". К тому же предполагается, что Косово может обратиться к ЕС с такой просьбой.

Документ ЕС считает юридически не обязывающими содержащиеся в преамбуле резолюции 1244 положения о Косово как о части Союзной Республики Югославия и о территориальной целостности последней.

Аргументы «против»

Выдвигаемые Сербией и Россией аргументы состоят в том, что Сербия, будучи суверенным государством, не соглашалась на независимость Косово, что Совет Безопасности ООН не принимал резолюций, разрешающих независимость, а значит, она противоправна.

Некоторые страны ЕС — Греция, Испания, Кипр, Словакия, Болгария и Румыния — согласны с этой позицией, хоть и не наложили вето на миссию Евросоюза.

Сербия и Россия также заявляют, что резолюция 1244 не предусматривает независимости Косово. Они приводят в пример статью 10 резолюции, где говорится только о "существенной автономии в рамках Союзной Республики Югославия" для Косово, а это, по их мнению, блокирует путь к независимости.

Белград и Москва также указывают, что международное присутствие в Косово, согласно резолюции 1244, должно быть одобрено и утверждено ООН, а миссия ЕС такого одобрения не получила.

Глава российского МИД Сергей Лавров по этому поводу сказал: "Речь идет о подрыве всех устоев международного права, о подрыве всех тех принципов, которые с огромным трудом, ценой войн, жертв, кровопролитий Европа выработала, положила в основу своего существования, подрыва тех принципов, на которых зиждется ОБСЕ, принципов, заложенных в устав ООН".

Главный принцип, на который он ссылался — это принцип, согласно которому изменение границ возможно лишь при достижении соглашения об этом. С точки зрения Сербии и России, если такого соглашения нет, то и речи о независимости Косово идти не может.

Аркадий ВАСИЛЬЧУК.

ФОТОВЗГЛЯД

На Международном аэрокосмическом салоне "Сингапур Аэрошоу 2008" было представлено более 800 компаний из 42 стран.

Топливо этой машины — воздух!

Британский производитель уникальных спортивных автомобилей Morgan намерен представить в марте текущего года на моторшоу в Женеве свою новую разработку — электромобиль, получивший название LIFECar, сообщает Lenta.ru. Электроэнергия для четырех электромоторов, расположенных в колесах, вырабатывается силовой установкой на топливных ячейках в ходе электрохимической реакции между водородом и кислородом, забираемым из атмосферы.

КАЛЕЙДОСКОП

Родила вторую тройню

16-летняя аргентинская девушка по имени Памела родила трех девочек — во второй раз. В первый раз она родила трех девочек в 15 лет, а за год до этого родила своего первого ребенка — сына.

Все семеро детей появились на свет в результате преждевременных родов. Врачи говорят, что Памела и три ее новорожденные девочки чувствуют себя хорошо.

Корреспондент Би-Би-Си в Буэнос-Айресе передает, что история Памелы спровоцировала бурное обсуждение. В барах и кафе, а также на страницах газет молодую мать подвергли критике, поскольку многие посчитали ее сексуально распущенной.

После того, как Памела родила первую тройню, местные власти выделили семье землю и построили дом. Теперь мать Памелы надеется, что власти увеличат помощь семье.

Некоторые аргентинцы полагают, что больше всего Памела нуждается в совете по поводу того, как пользоваться контрацептивными средствами

Яичница для гангстеров

Дизайнерская фирма из Гонконга предложила оригинальный способ приготовления яичницы специально для гангстеров или для тех, кто хочет на них походить, передает британское агентство Ananova.

Яйцо выливается в специальную формочку, изготовленную в виде различных типов стрелкового оружия. Таким образом, каждый желающий может приготовить себе яичницу в виде пистолета 45 калибра или популярного в гангстерской среде автомата UZI.

Формочки для гангстерской яичницы будут продаваться в 40 странах. Упаковка из четырех штук стоит около шести долларов.

Бизнес на трупах

44-летний бывший дантист США Майкл Мастромарино изобличен в противоправном расчленении более тысячи трупов и продаже костей, органов и кожи донорским пунктам в трех штатах.

Впоследствии они были пересажены более чем 20 тысячам пациентов в США, Канаде и европейских странах, сообщает Би-Би-Си.

Мастромарино платил гробовщикам по тысяче долларов за каждое тело, а сам заработал миллионы. На органах от одного покойника можно сделать до 100 тысяч долларов.

Пользуясь отсутствием контроля, Мастромарино поставил разделку трупов на поток. По словам прокуроров, он не только удалял органы без разрешения, но и скрывал возраст и болезни покойного.

Пить в обед или не пить?

Производители вина из центральной китайской провинции Хэнань подали в суд иск с требованием отменить решение местного правительства, которое запрещает местным чиновникам употреблять алкогольные напитки во время обеденного перерыва, говорится в сообщении агентства Синьхуа.

В 2007 году правительство провинции Хэнань решило улучшить моральный облик государственных служащих и запретило им выпивать алкоголь во время обеда. Решение властей значительно уменьшило число посетителей ресторанов и баров в обеденное время, что нанесло серьезный удар по доходам виноделов и рестораторов, говорится в сообщении Синьхуа.

Вкусный и разнообразный обед по традиции здесь сопровождается чашечкой рисовой водки или теплого вина из сои.

Электрический фонтан

Он открылся в Нью-Йорке на Манхэттене. Это работа известного дуэта скульпторов — Тима Ноубла и Сью Вебстер.

Уличная скульптура из света имеет размер — десять на десять метров. На ее создание потребовалось почти полкилометра неоновых трубок, создающих "гипнотическую иллюзию струящейся воды".

Недавно Ноубл и Вебстер порадовали жителей Лондона световой скульптурой "Жертвенное сердце", которая, по утверждению очевидцев, представляла собой огромное вращающееся кровоточащее сердце из сотен светящихся лампочек.

Самая вкусная вода

Водопроводная вода в Лос-Анджелесе и канадском городе Клирбруке была признана самой вкусной по итогам конкурса, в котором участвовали города и компании из 19 штатов США и девяти других стран.

Качество воды в городах оценивалось по нескольким критериям: вкус, запах, состав, послевкусие и чистота. Этот конкурс проводился уже в 18-й раз и считается самым крупным в мире.

Все СМИ заняты описанием мудрости и прозорливости нового президента

*Прошел год с момента вступления в должность президента Туркменистана **Гурбангулы Бердымухамедова**. Что изменилось?*

Главной проблемой, оставшейся в наследство от предшественника, стал для Бердымухамедова кадровый дефицит. Подавляющее большинство квалифицированных кадров государственного управления высшего и среднего звена были подвергнуты репрессиям, многие были вынуждены покинуть страну.

Если сам Ниязов использовал репрессивный аппарат в качестве метода управления страной, то новый президент по многим причинам не может себе этого позволить. Критерием подбора на руководящие должности для него является личная преданность, основанная в первую очередь на родственных и клановых связях, что только обострило кадровый голод.

У новой власти остается еще один "сундук" из наследства Ниязова. Речь идет о многочисленных политических заключенных и бывших чиновниках высшего ранга, осужденных при Ниязове по обвинению в коррупции. Понимая всю абсурдность большинства обвинений, Бердымухамедов не спешит с их освобождением, опасаясь любых возможных конкурентов.

Несмотря на то, что на первых порах новый президент всячески подчеркивал главенствующую роль в создании государства первого президента Ниязова и позиционировал себя как верного продолжателя его дел, фактически с первых дней Бердымухамедов начал демонтаж самых одиозных атрибутов культа личности Ниязова.

Были убраны изображения профиля Ниязова с экранов телевизора, где они сопровождали каждую передачу государственного телевидения, стало заметно меньше портретов Ниязова на фасадах зданий, было возвращено празднование женского дня 8 Марта, отмечавшегося ранее в день рождения матери Ниязова Гурбансолтан-эдже.

Но в школах и вузах все так же изучают книгу Ниязова "Рухнама", правда, всем школьникам приказано обернуть свои тетради так, чтобы закрыть на них портрет первого президента. Иностранные делегации все так же направляются почтить память Ниязова в его фамильную усыпальницу, но уже объявлено о том, что портреты Ниязова будут убраны с национальной валюты.

Но говорить о ликвидации культа личности как такового нельзя, просто на место одной личности пришла другая. Для расцвета нового культа времени прошло довольно мало, но все признаки его нарождения существуют.

Не обошелся новый глава государства без провозглашения собственной "стройки века": на пустынном побережье Каспийского моря, вблизи крупного нефтеперерабатывающего завода провозглашено начало строительства большой туристической зоны "Аваза".

Точно так же, как и во времена Ниязова, все государственные СМИ Туркменистана (а других в стране просто не существует) заняты описанием мудрости и прозорливости нового президента, уже заслужившего титул "Президент-реформатор". Точно так же все мало-мальски значимые назначения на государственные должности производит лично президент, он же подписывает "разрешения" на контракты по строительству каждого отдельного дома и предприятия.

Во всех СМИ Туркменистана начали публиковаться благодарности Бердымухамедову за возвращение туркменскому обществу оперы и цирка, за строительство новых кинотеатров, за восстановление Академии наук, возможность учиться за рубежом и за все остальное, что в свое время ликвидировал Ниязов, а новый президент вернул людям.

Через год после вступления в должность Бердымухамедова стало ясно, что основные принципы руководства страной останутся без изменений. Строгое единоначалие, 100-процентная персонификация власти, отсутствие гражданских и экономических свобод для граждан страны — вот квинтэссенция года правления нового президента.

К окончанию первого года правления Бердымухамедова наконец оформилась его собственная идеология, которая носит название "эпохи нового Возрождения нации". В чем, собственно, заключается собственно "возрождение", не понятно.

Практически все международные наблюдатели отмечают, что перемены в Туркменистане — реальные и декларируемые — носят лишь косметический характер и не привели к значимым результатам. Все факторы внутренней политики, столь раздражавшие западные демократии во времена Ниязова, существуют до сих пор.

Запрет на деятельность независимых СМИ, наличие политических заключенных, преследование гражданских активистов, фактически продолжающаяся информационная изоляция, тотальная коррупция — все это не изжито и при новой власти.

Колоссальные поступления валюты за продаваемый газ позволяют и дальше откладывать назревшие реформы. Однако ход развития общества уже напоминает властям о том, что перемены могут произойти и без их ведома. До недавнего времени в Туркменистане были отмечены только единичные случаи проявлений так называемого "нетрадиционного ислама", но независимые эксперты уже всерьез говорят о "талибанизации" молодежи страны и возможном развитии ситуации по афганскому сценарию.

И ответа на этот вызов у властей нет. Кроме разве что возврата к репрессиям времен Ниязова.

Мурад ГЕЛЬДЫЕВ, для BBCRussian.com, Ашхабад.

Безграмотный учитель

Американец Джон Коркоран 17 лет преподавал в одной из средних школ Калифорнии, не умея ни читать, ни писать, сообщается на сайте телеканала 10news.com.

Учась в начальной школе, Коркоран так и не сумел освоить чтение и письмо, однако учителя обращали на это мало внимания — маленького Коркорана причислили к категории "дурачков" и переводили из класса в класс.

В старших классах Коркоран уже сам принялся изощряться, врать, пропускать уроки, чтобы скрыть от окружающих свою безграмотность. Он крал тесты, просил друзей выполнять за него задания, подделывал документы и в 1956 году получил-таки свой диплом.

Затем он таким же образом продолжил свое "обучение" в Texas Western College, который закончил со степенью бакалавра в области образования. Сразу после этого он устроился преподавателем в среднюю школу Oceanside School District в Калифорнии. Не зная грамоты, он делал ставку, по собственным словам, "на устное и визуальное образование". Параллельно Коркоран приторговывал недвижимостью и достиг заметных успехов на этом поприще.

Лишь постепенно, с возрастом, в нем проснулись горечь от осознания своего недостатка и угрызения совести. "Как учителя меня страшно удручало то, что я вот учу детей, а сам не умею читать, — признался Коркоран. — Мне стало стыдно за себя, за всю нашу страну, за наши школы, в которых детей не могут научить читать!"

Народная Воля http://www.nv-online.info
28 ЛЮТАГА 2008 г.

Галіна Пазьняк

Беларусь у сэрцы

(Працяг. Пачатак у №№7—10, 13—14, 17—18, 21—22, 25—26.)

Так ішло нашае фронтаўскае супрацоўніцтва з медыкамі Беларусі, з НДІ радыяцыйнай медыцыны, з Цэнтрам шчытападобнай залозы пры клінічным шпіталі №1 Менска пад кіраўніцтвам прафэсара Я.Дзямідчыка і іншымі медычнымі ўстановамі, якое доўжылася, пакуль антыбеларускі рэжым не скасаваў усю нашую дзейнасьць і дзейнасьць НДІ ў Менску.

Асабліва запомнілася нашая паездка ў Салігорскі дзіцячы дом, дзе знаходзіліся дзеткі дашкольнага ўзросту. Выхавацелькі гэтага Дому вельмі прыхільна і з вялікай павагай сустрэлі кандыдата ў прэзыдэнты Зянона Пазьняка і ўсіх, хто прыехаў разам зь ім (гэта дэпутаты Вярхоўнага Савета, Ул.Заблоцкі і С.Антончык, сябры Управы Фронту і фронтаўцы Салігорска), дзякавалі за пачастункі і цацкі, якія мы прывезьлі. Яны паказалі нам, як жывуць дзеткі, пазбаўленыя ўласнага дому. Усё было чыста, прыгожа, з густам і пасямейнаму ўтульна. Прыемна ўразілі нас і самі выхавацелькі. Ад іх зыходзіла вялікая цеплыня і дабрыня да гэтых маленькіх грамадзянаў Беларусі, якім яны замянялі сям'ю. Жанчыны задавалі шмат пытаньняў пра пляны Пазьняка як кандыдата ў прэзыдэнты наконт дзіцячых установаў для дзяцей-сірот, Зянон Пазьняк пытаўся пра патрэбы такіх дзіцячых установаў. Размова была цікавая і карысная.

Потым мы вышлі ў садок, дзе гулялі дзеткі з выхавацелькамі. Дзеці літаральна абляпілі ўсіх нас, і кожны зь іх прасіўся "на ручкі". "Тата-тата, мама-мама", — жаласна прасіліся яны. І калі мы бралі дзяцей на рукі, яны аж дрыжэлі, прыціскаючыся і ўчапіўшыся за нас ручкамі, так неставала ім бацькоўскай і матчынай ласкі.

Успамінаючы гэтую сустрэчу, шчыміць душа ад вялікага жалю і любові да тых абяздоленых дзяцей. Па дарозе назад у Менск Пазьняк гаварыў пра тое, як шмат трэба зрабіць для гэтых дзетак у новай вольнай Беларусі, каб яны расьлі годнымі і спакойнымі, каб безбацькоўшчына іх не зламала.

Менскі Дом дзіцяці №1 (на вуліцы Разінскай, у раёне Грушаўкі) таксама пакінуў вялікі і балючы сьлед у нашых душах. Зянон Пазьняк прыехаў туды, каб пазнаёміцца з праблемамі "чарнобыльскіх дзяцей" у літаральным значэньні гэтага слова, бо тут знаходзіліся дзеткі ад некалькіх месяцаў жыцьця, і ўсе яны былі калекамі, інвалідамі з нараджэньня. Была там дзяўчынка з "ластамі" замест ножак, дзяўчынка, якая нарадзілася з паталёгіяй слыху (слыхавы апарат у яе адсутнічаў), хлопчык, які нарадзіўся з адной ручкай (таму яна была вельмі вялікая) і непрапарцыянальна малымі ножкамі, але вельмі не па гадах разумова разьвіты і г.д. Былі дзеткі, дагляд за якімі быў немагчымы ў дамашніх умовах (калецтва вымагала спэцыяльнага дагляду і медычнага абсталяваньня). Адна такая дзяўчынка трапіла сюды, але кожны дзень да яе прыходзіла яе маці і знаходзілася тут са сваёй няшчаснай дачушкай.

Тут, у гэтым Доме дзіцяці — прытулку страшнай дзіцячай паталёгіі, мы ўбачылі шмат бяды і гора, што прынёс людзям Чарнобыль.

Дзякуючы аўтарытэту Фронту і міжнароднаму аўтарытэту Зянона Пазьняка, мы пазнаёмілі са сваёй дзейнасьцю некаторых дзеячоў за мяжой, якія аднесьліся да нас з вялікай прыхільнасьцю. Яны высылалі розную медычную дапамогу. Уся дапамога была мэтавая. Папярэдне мы наведвалі дзіцячыя шпіталі, высьвятлялі іхныя цяжкасьці і вострыя праблемы, а потым пад гэтыя канкрэтныя запатрабаваньні зьвярталіся за дапамогай да замежных спонсараў. Нам давяралі і дапамагалі рознай медычнай апаратурай, дарагімі лякарствамі і абсталяваньнем. Найбольш дапамогі на імя Камітэта "Дзеці Чарнобыля БНФ" мы атрымлівалі зь Нямеччыны, была дапамога і з Аўстрыі, зь Вялікабрытаніі, ад беларускай эміграцыі ЗША.

Наведаўшы аднаго разу Дом дзіцяці №1, мы даведаліся, што выхавацелі Дому марылі набыць іхным дзецям дарагі апарат для дыханьня. Ён патрэбен быў дзеткам-астматыкам з аслабленым імунітэтам. Але супрацоўнікі казалі нам, што гэта толькі іхныя мары, бо ў "Мінздрава" няма сродкаў, і гэта нерэальная раскоша. Праз нейкі час мы прывезьлі да іх чалавека зь вялікім сэрцам, бізнэсмэна зь Нямеччыны Вернера Лянгенбана. Убачыўшы хворых дзяцей-інвалідаў, немаўлят, ён тут жа выпісаў чэк на набыцьцё гэтага апарата. Выхавацелі і медработнікі незвычайна абрадаваліся, але, папрасіўшы прабачэньня, прыняць чэк адмовіліся. Яны патлумачылі, што прыняць вось так наўпрост чэк, мінуючы "кіруючыя інстанцыі", яны ня маюць права, што за гэта іх могуць абвінаваціць у чым заўгодна, а калі гэты чэк перадаць у Мінздраў, то ён да іх наўрад ці дойдзе. Спадар Лянгенбан ніяк ня мог зразумець гэтыя савецкія парадоксы. Ён усё пытаўся і перапытваў:

— Вам сапраўды патрэбны такі апарат?

— Так, — адказвалі яму супрацоўнікі Дому дзіцяці.

— Дык бярыце чэк і набывайце яго! — настойваў заходні бізнэсмэн.

— Ня можам, бо ня ведаем, як яго "апрыходаваць", баімся быць несправядліва абвінавачанымі і папасьці ў турму, — адказвала загадчыца Дому.

Тады зьдзіўлены немец разварочваецца да мяне і пытае: "А вы не баіцёся ўзяць адказнасьць на сябе, каб аформіць набыцьцё апарата на ваш Камітэт і перадаць яго сюды?"

Я не вагаючыся згадзілася. Так мы "разам" набылі тое, пра што так марылі супрацоўнікі Дому дзіцяці. Усё афармілі як сьлед, хоць я і дагэтуль не ўпэўнена, што мая рашучасьць адпавядала савецкім законам.

Пазьней такія дабрачынныя акцыі паўтараліся шмат разоў. Але спадар Лянгенбан цяпер ужо заранёў высьвятляў патрэбы дзіцячых шпіталёў і прывозіў неабходнае сам. Ён дапамагаў ня толькі медапаратурай, а і харчаваньнем, вітамінамі, лекамі і г.д. Вернер Лянгенбан некалькі год запар рэгулярна прыязджаў разам з Ларысай Верас у Менск і ўвесь час дапамагаў хворым беларускім дзецям, аддаючы для гэтага ня толькі ўласныя сродкі. Ён арганізаваў у Нямеччыне Чарнобыльскі фонд і зьбіраў грошы для нашых хворых дзяцей па ўсёй краіне. Акрамя таго ён ськіроўваў некаторыя добрыя сэрцы сваіх сяброў за мяжой на беларускія праблемы дзіцячага здароўя, і тыя таксама прысылалі сваю дапамогу ў Беларусь праз Народны Фронт.

Шмат разоў БТ рабіла рэпартажы пра дабрачынную дзейнасьць Вернера Лянгенбана, і ён заўсёды падкрэсьліваў, што на Беларусі ён дзейнічае выключна праз Народны Фронт. У адносінах супрацоўніцтва з Народным Фронтам ягоная пазыцыя была пасьлядоўная. Пазнаёміўшыся з Зянонам Пазьняком, ён быў моцна ўражаны асобай старшыні Народнага Фронту і ня раз казаў аб сваёй упэўненасьці, што Зянон Пазьняк будзе сапраўдным прэзыдэнтам Беларусі. "Інакш у вашай краіне ня можа быць, вам патрэбен толькі Пазьняк і ніхто іншы", — ня раз казаў спадар Лянгенбан, калі мы з сябрамі Камітэту размаўлялі зь ім. Аўтарытэт Пазьняка ў вачах заходняга бізнэсмэна аўтаматычна перадаваўся і на Фронт, які ён ўзначальваў, і на фронтаўскі Камітэт "Дзеці Чарнобыля БНФ".

Але сустракаць заходняга госьця для Фронту было на тыя часы ня так проста. У нас не было ніякага транспарту, і кожны раз прыходзілася проста "вылузвацца са скуры", каб здабыць на 2—3 дні аўтамабіль. Аднаго разу я зьвярнулася да начальніка аўтабазы ў Менску, дзе працаваў адзін наш дэпутат, прыхільнік Фронту. Разам зь ім я і прыйшла ў кабінэт начальніка з дэпутацкім запытам-просьбай выдзеліць Чарнобыльскаму камітэту які-небудзь транспарт, патлумачыла, што прыязджае госьць зь Нямеччыны з мэтай дапамогі беларускім дзіцячым шпіталям. Не вазіць жа яго па шпіталях на таксі. "Мы заплацім, колькі трэба", — заверыла я. Ніякіх грошай Камітэт ня меў, але мы з сябрамі вырашылі "ськінуцца" на гэтую справу. Начальнік пачасаў патыліцу — і выдзеліў нам у арэнду мікрааўтобус савецкай вытворчасьці бясплатна (Чарнобыль жа).

Тады замежныя камфартабельныя машыны для нас былі ўвогуле недаступныя, на Беларусі іх было няшмат, таму мы нават і ня надта задумваліся, што заходнія мільянеры на такіх машынах ня езьдзяць. Наадварот, мы вельмі ўзрадаваліся таму "ўазіку".

Як выхаваныя заходнія людзі, ні спадар Лянгенбан, ні Ларыса (якая суправаджала яго як перакладчыца) і вокам не міргнулі, што для іх гэта папросту экзатычны транспарт. Так і вазілі мы нашага госьця на кандовай савецкай "Лорэн-Дзітрых" ад шпіталя да шпіталя, якім спадар Лянгенбан ахвяраваў вялікія сродкі на медычнае абсталяваньне для лячэньня беларускіх дзетак. Назаўтра нараніцы мы сустракаліся, каб прадоўжыць нашую працу, але часам прыходзілася разам з гасьцямі гадзіну-паўтары чакаць наш "транспарт". Зараз ужо мы і ня памятаем, якія тады былі вялікія праблемы з палівам, і наш Юзік Такушэвіч траціў шмат намаганьняў, каб "заправіць" машыну для нашых паездак. Ён езьдзіў ад "запраўкі" да "запраўкі" ў пошуках паліва, (знайсьці якое было вельмі цяжка), выстойваў велічэзныя чэргі (дзе яно, нарэшце, знаходзілася ў невялікіх колькасьцях), пакуль прыязджаў па нас. Але ні спадар Лянгенбан, ні спадарыня Ларыса ня крыўдзіліся за такія затрымкі. Яны ведалі нашу цяжкую беларускую сітуацыю, бачылі, як усе мы стараемся, але пазьбегнуць некаторых праблемаў тады часамі было немагчыма.

Аднаго разу па рэкамэндацыі спадара Лянгенбана ад ягонага сябра (якога мы ніколі ня бачылі) на імя Камітэту "Дзеці Чарнобыля БНФ" прыйшоў вялікі канвой з Аўстрыі. Але ўлады (магчыма, спэцыяльна, каб не аддаваць яго Народнаму Фронту) ськіравалі гэтую мэдычную дапамогу да кіраўніцы чарнобыльскага фонду лекара Т.Белаокай. Яна атрымала гэты канвой, нягледзячы на тое, што там стаяла назва нашага Камітэту і маё імя атрымальніка. Лекары, зь якімі мы папярэдне дамовіліся, гэтую дапамогу не атрымалі, а спонсар, даведаўшыся, што яго дапамога не дайшла да адрасата, быў абураны і больш яе не высылаў.

Адказнасьць за такую недарэчнасьць была на дзяржаўных структурах, якія аддалі дапамогу ня ў тыя рукі, і на тым, хто яе атрымаў. Няма сумніву, што лекі былі выкарыстаны спадарыняй Белаокай па прызначэньні, але гэта ў нас "няма сумненьняў". Нашы дабрадзеі на Захадзе маглі думаць інакш.

Праз Камітэт "Дзеці Чарнобыля БНФ" было ахвяравана шмат усялякай неабходнай і дарагой апаратуры розным медычным дзіцячым установам: Анкалягічнаму цэнтру пад кіраўніцтвам лекара Вольгі Алейнікавай, Цэнтру па лячэньні шчытападобнай залозы пад кіраўніцтвам доктара навук прафэсара Я.Дзямідчыка і Цэнтру ў Аксакаўшчыне, аддзяленьню дзіцячай паталёгіі 1-га клінічнага шпіталя і дзіцячаму аддзяленьню 3-га шпіталя г.Менска, спэцыялізаванаму Дому дзіцяці №1, 4-му клінічнаму шпіталю Менска і шмат каму яшчэ (усе назвы зараз мне цяжка і ўспомніць).

Трэба сказаць, што ўвесь цывілізаваны сьвет адгукнуўся на нашую бяду. Шмат краінаў запрашалі беларускіх дзяцей на аздараўленьне, і пачалося гэта праз Чарнобыльскі камітэт Народнага Фронту "Дзеці Чарнобыля" на чале з Г.Грушавым. Камуністычнай уладзе, якая панавала ў СССР над усім, у сьвеце не давяралі. Наш Камітэт потым таксама займаўся вывазам дзяцей на аздараўленьне за мяжу.

Але паступова замежным аздараўленьнем беларускіх дзяцей пачалі займацца многія спэцыяльна ўтвораныя арганізацыі. Абсалютна недаступнае замежжа пры камуністычнай уладзе, дзе (як здавалася многім абывацелям) "даляры растуць проста на дрэвах", праз магчымасьць аздараўленьня чарнобыльскіх дзяцей адразу прывабіла ўвагу розных людзей, у тым ліку і несумленных. Вакол замежных дзіцячых паездак хадзілі ўсялякія нядобрыя чуткі, узьнікла шмат спэкуляцыяў, бруду і ўсялякага падману.

Для нас было прынцыпова важна захаваць чысьціню нашых мэтаў: дапамагаць сапраўды хворым беларускім дзецям паправіць іхнае здароўе. Таму было дамоўлена з кіраўніцтвам НДІ радыяцыйнай медыцыны, што арганізацыяй такіх паездак (візы, білеты, зборы і г.д.) будзе займацца фронтаўскі Чарнобыльскі камітэт, а хворых дзяцей на аздараўленьне будуць падбіраць і рэкамендаваць лекары. У кожную групу суправаджэньня (чатыры чалавекі) павінен увайсьці лекар, перакладчык, два педагогі. Мы адчувалі, што такая нашая пазыцыя (у той час, калі вакол такіх паездак за мяжу няроздка рабіліся спэкуляцыі і нядобрыя справы) выклікала павагу ў лекараў НДІ, і мы пасьпяхова супрацоўнічалі.

Супрацьлеглы (італьянскі) бок, які прымаў беларускіх дзяцей, прасіў ад нас, каб кожны раз мы прысылалі хворых дзяцей з розных беларускіх раёнаў і паведамлялі нам, адкуль павінны быць хворыя дзеці. Гэта было няцяжка, бо лекары НДІ радыяцыйнай медыцыны добра ведалі ўсе забруджаныя радыяцыяй беларускія раёны, усе мястэчкі і вёсачкі, ведалі тых дзетак, Фронтаўцы, якія суправаджалі дзяцей у Італіі, казалі, што італьянцы надзвычай любяць дзяцей і ставяцца да іх вельмі сардэчна.

Калі італьянцы пачалі медычныя дасьледаваньні беларускіх дзяцей, у нашых лекараў, якія былі там з дзецьмі, гэта выклікала занепакоенасьць. Высокаадукаваны лекар Інстытута спадарыня Людзьміла Васілевіч казала нам, што там, у Італіі, яна пыталася ў іхных лекараў, якія дасьледаваньні яны хочуць праводзіць, што гэтага нельга рабіць без дазволу бацькоў і дзяржавы, што мы (беларускія лекары) можам прапанаваць сваё супрацоўніцтва, і тады ўсё гэта будзе насіць адкрыты характар. У рэшце рэшт, гэта ёсьць інтэлектуальная медыцынская каштоўнасьць Беларускай дзяржавы, і нельга рабіць дасьледаваньні за сьпіной гэтай дзяржавы. З.Пазьняк абмяркаваў гэтую праблему з кіраўніцтвам НДІ радыяцыйнай медыцыны. Было дамоўлена прапанаваць італьянскаму боку супрацоўніцтва з нашым НДІ і вырашана, што з гэтай прапановай да іх зьвернецца кіраўнік Чарнобыльскага камітэта. Таму суправаджаць наступную групу дзяцей (зь мястэчка Альманы Столінскага раёна) павінна была я.

Італьянцы аднесьліся да нашых дзяцей сапраўды вельмі сардэчна, вазілі іх на мора, на экскурсіі і г.д. Але самае вялікае ўражаньне зрабіла сустрэча з Папам Рымскім Янам Паўлам II у Ватыкане. Зь незвычайнай дабрынёй Папа благаславіў нашых дзетак, пажадаў усім нам здароўя, сказаў некалькі цёплых слоў па-беларуску. Мы былі ўзрушаныя.

Пазьней у мяне адбыліся перамовы з кіраўнікамі італьянскага праекта, дзе я выказала занепакоенасьць "ананімнымі" медычнымі дасьледаваньнямі нашых дзяцей італьянскім бокам і прапанавала ім адкрытае супрацоўніцтва з НДІ радыяцыйнай медыцыны. Да прапановы італьянцы аднесьліся з энтузіязмам, але потым праект быў зачынены. (Пазьней я даведалася, што тут умяшаліся зацікаўленыя асобы з МАГАТЭ. Відаць, МАГАТЭ якраз і прыклала "лапу" што да "ананімнасьці" праекта.)

Паступова дзіцячыя паездкі за мяжу ў "капіталістычныя краіны" паказалі, што яны неадназначна ўплываюць на духоўны сьвет нашых дзяцей і іхных бацькоў. Заходнія людзі бачылі, што да іх прыязджаюць дзеці з небагатых ці проста бедных беларускіх сем'яў і, спачуваючы дзецям, якія сталі ахвярамі камуністычнага рэжыму, усяляк стараліся парадаваць іх рознымі падарункамі ім, і нават іхным бацькам. Дамоў дзеці вярталіся з валізкамі адзеньня, ласункаў, часам нават нейкай апаратурай, скажам, магнітафонам, што на тыя часы ў нас каштавала дорага і простым грамадзянам было недаступна. У выніку для некаторых асобаў паездкі сталі набываць мэту спажывецтва і нажывы, у іншых спараджалі псіхалёгію давальства і ўтрыманства. Кіраўніцтва Фронту было занепакоена такім станам рэчаў. Намэнклятурная ўлада нічым не дапамагала ў гэтай справе, толькі перашкаджала. Урэшце мы адышлі ад заходніх дзіцячых паездак за мяжу і прадаўжалі займацца дапамогай шпіталям і дзіцячым установам.

Неяк перад Калядамі з намі зьвязаліся грамадзкія дзеячы зь Нямеччыны. Немцы, у сем'ях якіх гасьцявалі хворыя беларускія дзеці, вырашылі пераслаць для іх калядныя падарункі, але перадаць іх давяралі толькі праз Народны Фронт. Ці дойдуць іхныя падарункі да адрасатаў не раскрадзенымі праз іншыя арганізацыі, яны сумняваліся.

Суправаджалі канвой чалавек дванаццаць немцаў, якія для гэтага ўзялі адпачынкі за ўласны кошт. (Адкуль жа было ведаць немцам, што Фронт — грамадзкая арганізацыя, якая ня мае ніякіх "складоў" для іхных падарункаў.)

Тым ня менш высакародны парыў простых нямецкіх грамадзянаў адштурхнуць мы не маглі і пагадзіліся прыняць падарункі і перадаць іх дакладна па адрасах, хоць разумелі, што сітуацыя няпростая. Суправаджаўшых канвой немцаў мы вырашылі разьмеркаваць на ноч па 2—3 асобы па ўласных кватэрах і заранёў падрыхтаваліся. А вось як быць з самым канвоем, куды выгружаць гэтыя скрыні — мы ня ведалі. І тады мы з Вольгай Кузьміч вырашылі ўзяць гэта на сваю дэпутацкую адказнасьць і выгрузіць скрыні з падарункамі ў свой кабінет у Гарсавеце. Варыянтаў проста больш не было. Які будзе аб'ём гэтага канвою — мы не ўяўлялі.

Пад'ехаўшы да беларускай мяжы, нямецкія сябры патэлефанавалі нам, але разьлічыць іхны прыезд у Менск дакладна было немагчыма. Прачакалі мы іх увесь дзень і дачакаліся толькі ўвечары, каля 21-й гадзіны.

Калі мы з Вольгай Кузьміч убачылі машыну-"фуру" — ледзь ня страцілі прытомнасьць (такая яна была вялікая). Што рабіць? Вечар, начальства ў гарсавеце няма, нікога няма, толькі паставы міліцыянт. Мы як дэпутаты і паведамілі яму, што будзем зараз грузіць скрыні канвою ў гарсавет.

Міліцыянт толькі лыпаў вачыма, як мы цягалі скрыні ў два ліфты і бясконца вазілі іх на чацьвёрты паверх. Працавалі мы (ад страху) вельмі хутка — усе былі мокрыя: і немцы, і фронтаўцы. У выніку ўвесь наш вялікі пакой Камісіі па адукацыі быў застаўлены цалкам ад падлогі да столі (засталася невялічкая шчыліна каля стала).

У канцы "разгрузкі", калі ўжо заставалася некалькі скрыняў, нечакана аднекуль зьявіўся старшыня гарсавета А.М.Герасіменка. Вочы яго акругліліся: "Што гэта вы робіце? Гарсавет — гэта ж ня склад", — разгублена зьвярнуўся ён да нас з Вольгай.

"Нам зь Нямеччыны перадалі падарункі для дзяцей. Заўтра мы іх будзем раздаваць. Не хвалюйцеся, Аляксандар Міхайлавіч, усё будзе ў парадку", — адказалі мы, хаваючы свой страх.

Аляксандар Міхайлавіч узяўся за галаву. "Заканчвайце хутчэй, заўтра пагаворым", — неяк разгублена вымавіў ён. (Гаворка назаўтра была. А.М. Герасіменка гаварыў з намі мякка, але цьвёрда: "Дзяўчаты, вы разумееце, што так рабіць нельга..." — і ўзяў з нас слова больш ніколі так не рабіць. Мы шчыра глядзелі ў вочы старшыні гарсавета і ва ўсім пагаджаліся зь ім, тлумачылі, што толькі вострая неабходнасьць прымусіла нас...)

Але сапраўдныя пакуты пачаліся назаўтра. Пакой быў цалкам загрувашчаны скрынямі. Фронтаўцы працавалі некалькі дзён, каб неяк перапісаць адрасы і тэлефоны на скрынях, потым каб абзваніць адрасатаў, а потым каб раздаць пасылкі бацькам, якія па нашым выкліку прыязджалі ў гарсавет на працягу некалькіх тыдняў. Так скончылася гэтая авантурная гісторыя, якая запомнілася нам гэтакім пагранічным станам душы: ад страху да жаху. Але ўрэшце — мы справіліся.

Памятаю аднаго разу, у 1994 г., на дзейнасьць Камітэта "Дзеці Чарнобыля БНФ" дабрадзеі падарылі 2 тысячы даляраў. Мы з сябрамі Камітэта закупілі на гэтыя грошы розныя пачастункі, цацкі для дзяцей і падчас нашых фронтаўскіх паездак па Беларусі разам з кіраўніком Фронту наведвалі дзіцячыя шпіталі і развозілі гэтыя падарункі дзецям.

Ведаючы нашую бескарысную дзейнасьць, на нашыя патрэбы адгукаліся і беларускія прадпрымальнікі. Нам прысылалі і харчаваньне, і адзеньне, і цацкі-цукеркі да сьвятаў для дзяцей. Усё гэта развозілася і раздавалася тым, хто адчуваў патрэбу ў такой падтрымцы. Аднойчы адзін прадпрымальнік (на жаль, ня памятаю ягонае імя) прапанаваў нам мёд для дзяцей, шмат мёду. Мы прывезьлі гэты мёд у НДІ радыяцыйнай медыцыны і разам з галоўным лекарам Інстытута раздалі гэты мёд хворым дзецям з забруджаных раёнаў, якія знаходзіліся там на абсьледаваньні.

Выжываньне беларусаў забруджаных тэрыторыяў было надзвычай цяжкое. Вядома, што камуністычныя ўлады на Беларусі адмовіліся ад міжнароднай дапамогі (МАГАТЭ), заявіўшы Маскве, што "бяду мы адолеем самі". Такая заява прамаскоўскіх халуёў зь Беларусі была унікальная, бо ні адна дзяржава не зрабіла нічога падобнага, а велізарныя грошы міжнароднай дапамогі, якія выдзяляліся для ратаваньня Беларускай нацыі, былі прыўлашчаны Масквой. Такая была злачынная ўлада на Беларусі тагачасных сьлюньковых і К. Чарнобыльская трагедыя таксама выразна паказала подлы імпэрскі твар Масквы, якая расстраляла і апусьціла на галовы беларусаў радыяцыйныя воблакі над Магілёўскай вобласьцю, каб не пусьціць хмары далей ў Расею. Цяпер там радыяцыя, як у чарнобыльскай зоне.

Здавалася, усё было так відавочна, але праўду камуністы старанна хавалі. Народны Фронт расплюшчыў грамадзтву вочы на гэтую нашу бяду. Але нацыя ўжо была ў нейкім літаргічным сьне, хоць і моцна цярпела. Мы бачылі гэта ў кожным мястэчку, у кожнай вёсцы, куды адвозілі сваю дапамогу.

Бадай што ніводнага разу мы гэта не зрабілі без Зянона Пазьняка. Як ён жыў, калі адпачываў — напэўна, ніколі, бо пачынаючы з 1988 года на сваіх плячах нёс велізарны клопат і Старшыні БНФ, і потым Старшыні Апазыцыі Вярхоўнага Савету. Але калі мы атрымоўвалі дапамогу з-за мяжы ці ад беларусаў і зьбіраліся яе развозіць у месцы вострай патрэбы, разам з намі амаль заўсёды быў Зянон Пазьняк, ахвяруючы ўсімі сваімі "выхаднымі" днямі і адмаўляючыся ад самага малога адпачынку. У выніку гэтых наведваньняў ён на свае вочы бачыў шмат беларускага гора і, як дэпутат Вярхоўнага Савета, рабіў усё магчымае, каб дапамагчы канкрэтным людзям у іхняй бядзе.

А людзям не хапала элемэнтарнага. Не было лекаў, не хапала лекараў, харчаваліся з забруджаных радыяцыяй агародаў, і беларусы ціха паміралі. Асабліва шчыміць сэрца, калі ўспамінаю адну сям'ю з-пад Хвойнікаў. Пра яе мне паведаміла прыхільніца Народнага Фронту, расказала пра бядотны і трагічны стан гэтай сям'і.

Разам з З. Пазьняком мы наведалі гэты сьціплы беларускі дом, убачылі маладую жанчыну, якая памірала (цень сьмерці быў бачны на яе твары), яе двух дзетак і яе бацькоў. Маці паміраючай моўчкі плакала па дачцы, бацька стрымана расказваў пра тое, што лячыцца няма дзе і за што. "Атруцілі нас і кінулі, вось і паміраем мы на сваёй зямельцы", — ціха і нясьпешна казаў бацька, быццам гэта быў расповяд пра нешта звычайнае... Незвычайны жаль ахапіў маю душу, хацелася аддаць усё сваё сэрца, каб дапамагчы гэтым сьціплым беларусам. А яны яшчэ дзячылі нас за калядныя пачастункі і нейкія прадукты...

Калі мы вярталіся, Пазьняк маўчаў, твар ягоны стаў шэрым ад болю за нашых людзей, выратаваць якіх, дапамагчы было мажліва толькі маючы дзяржаўныя магчымасьці і паўнамоцтвы.

Колькі людзкога гора давялося ўбачыць у гэтых нашых фронтаўскіх паездках па Беларусі, наведваючы беларускія сем'і! Але для іхнага сапраўднага ратаваньня патрэбны быў нацыянальны парлямант і нацыянальны ўрад, якія б па-дзяржаўнаму вырашалі гэтую праблему. Пасьля такіх паездак (я разумела) Зянон Пазьняк не шкадаваў сябе ў змаганьні за свой народ. Хоць куды ж было "больш", калі ўсё сваё жыцьцё ён паклаў на гэтае змаганьне.

Рэжым Лукашэнкі, як кажуць, убіраўся ў пер'е, і атакі на беларушчыну йшлі адна за адной. Тым часам нам дапамагалі зусім чужыя і невядомыя людзі з замежжа, якія па ўласнай ініцыятыве зьбіралі грошы на канвой у Беларусь, набывалі медыкаменты, медычнае абсталяваньне, нават харчаваньне для дзяцей з забруджаных раёнаў Беларусі, бралі адпачынкі за свой кошт, каб адвезьці ўсё набытае на Беларусь.

Аднаго разу мне прыйшлося дапамагчы "растаможыць" такі канвой у Мытным камітэце (што на вул. Славінскага) адной дабрачыннай арганізацыі, здаецца, зь Вялікабрытаніі ці Даніі, каб яны маглі адвезьці сваю дапамогу ў чарнобыльскі раён Беларусі. Гэта была раніца, нядзеля. У таго, хто павінен быў сустрэць канвой у Менску, нешта не спрацавала, таму патэлефанавалі мне і папрасілі тэрмінова прыехаць у Мытны камітэт.

Так я пазнаёмілася зь дзіўнымі заходнімі людзьмі, якім не было абыякавым гора беларускіх дзяцей. Мы разгаварыліся, і яны пачалі мне дзячыць, што я (як яны казалі, нягледзячы на выхадны дзень) прыехала ім дапамагчы. Я перапыніла гаворку: "Вы прыехалі дапамагаць нашым дзецям, якія ў бядзе, гэта я вам дзякую ад усяго сэрца за вашую дабрыню".

У нас склалася поўнае ўзаемаразуменьне, і тады кіраўніца канвою расказала мне, што гэта ня першы іхны візіт на Беларусь. "Мы бачым, што часы мяняюцца, мяняюцца і вашыя прадстаўнікі ўлады. Вось, напрыклад, у нашай краіне быў з візітам ваш кіраўнік дзяржавы С.Шушкевіч. У яго быў афіцыйны "пратакол" візіту, а ягонай жонкай апекаваліся мы. Яна не хадзіла па крамах за "дэфіцытамі", трымалася годна. Яна нам спадабалася, таму на разьвітаньне мы падрыхтавалі ёй розныя падарункі (для яе і яе дзетак), бо добра ведаем, што звычайна кіраўнікі з Савецкага Саюза заўсёды нешта везьлі дадому. Але спадарыня Шушкевіч катэгарычна адмовілася ад усялякіх падарункаў і ветліва адхіліла ўсё, што мы ёй прапанавалі. Гэта нас усіх прыемна ўразіла як прыклад годных паводзінаў вашай першай лэдзі".

Мне было надзвычай прыемна гэта пачуць, бо спадарыня Шушкевіч пакінула добрыя думкі ня толькі пра сябе, а і ўвогуле пра беларускіх жанчын.

(Працяг будзе.)



Галіна Пазьняк (Вашчанка) дзецьмі Чарнобыля ў гасьцях у Папы Рымскага Яна Паўла II.

Зянон Пазьняк у мястэчку Дулебы (Бярэзінскі раён).

Народная Воля http://www.nv-online.info
28 ЛЮТАГА 2008 г.

ХОРОШАЯ НОВОСТЬ

Крепитесь, люди, скоро лето!

Сотрудники общественной организации "Ахова птушак Бацькаўшчыны" (АПБ) зарегистрировали первых мигрирующих птиц. А коль птицы начинают возвращаться из теплых краев, значит, скоро весна.

Первыми мигрантами стали гуси-гуменники. Их стаю зафиксировали в Каменецком районе Брестской области. Гуменник — одна из самых ранних перелетных птиц. Эти пернатые зимуют в странах Западной Европы, в том числе в Англии, Голландии, Германии и Венгрии. Они раньше остальных птиц покидают места зимовки и улетают на родину, где приступают к созданию гнезд. "Обычно миграция гусей-гуменников происходит в марте, — пояснил специалист. — Однако относительно теплая зима заставила птиц начать путешествие на родину немного раньше обычного".

КРЫМІНАЛ

Рабы XXI стагоддзя

Гомельскае ўпраўленне па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС падрыхтавала для накіравання ў суд 38 крымінальных спраў па фактах гандлю людзьмі, 39-я крымінальная справа — па факце стварэння злачыннай арганізацыі.

Як паведаміў БелаПАН намеснік начальніка УБАЗіК Анатоль Дзмітрыенка, крымінальныя справы распачыналіся ў межах расследавання злачыннай дзейнасці рэчыцкай групоўкі. Падчас следства высветліліся факты вывазу грамадзян Беларусі на будаўнічыя аб'екты Расійскай Федэрацыі з мэтай працоўнай эксплуатацыі.

"Група з дзевяці чалавек, якая вывозіла нашых грамадзян на будоўлі Расіі, з'яўлялася структурным падраздзяленнем рэчыцкай групоўкі. З-за таго, што пацярпелых ад такога працаўладкавання дастаткова шмат, крымінальныя справы мы распачыналі па групах, а не асобных людзях. А траплялі на вудачку бандытам жыхары не толькі Рэчыцы, але і Рагачоўскага, Жыткавіцкага, Хойніцкага, Буда-Кашалёўскага раёнаў вобласці", — зазначыў А.Дзмітрыенка.

Паводле слоў суразмоўцы, у асноўным члены злачыннай групоўкі вывозілі на будаўнічыя аб'екты людзей з сельскай мясцовасці, непатрабавальных да ўмоў працы і менш адукаваных. "Беларускім гастарбайтэрам не плацілі зарплат, яны не мелі выхадных, магчымасці вярнуцца дадому. Былі выпадкі, калі нашы грамадзяне сядзелі ў Маскве на вакзалах з шапкай і прасілі міласціну, каб паехаць дадому", — падкрэсліў намеснік начальніка УБАЗіК.

А.Дзмітрыенка запэўніў, што пасля вынесенага ў 2007 годзе прыгавору суда аб 10-гадовым пазбаўленні волі групе асоб, якія вывозілі жыхароў Гомельскай вобласці на будаўнічыя аб'екты РФ з мэтай працоўнай эксплуатацыі, сітуацыя ў рэгіёне палепшылася. "І цяпер многія ездзяць у Расію на заробкі, але іх брыгадзіры прыязджаюць да будаўнікоў дадому і выплачваюць зарплаты, бяруць распіскі. Вядома, людзі не атрымліваюць вялікіх грошай, але хоць нейкі заробак ёсць. Магчыма, гэта будзе навукай для аматараў зарабіць грошы на сваіх жа земляках", — падсумаваў А.Дзмітрыенка.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

СІТУАЦЫЯ

Дэфіцыт псіхіятраў

У Беларусі, асабліва ў сельскай мясцовасці, да гэтага часу існуе праблема забяспечанасці насельніцтва псіхіятрычнай дапамогай. Пра гэта паведаміў галоўны псіхіятр Міністэрства аховы здароўя Павел Рынкоў на рэспубліканскай нарадзе аб выніках працы псіхіятрычнай службы ў 2007 годзе.

Паводле слоў П.Рынкова, у сямі раёнах Беларусі ўсё яшчэ няма ўрачоў-псіхіятраў, у мінулым годзе такіх раёнаў было 11. Яшчэ ў 10 раёнах краіны, паводле яго слоў, спецыялісты сумяшчаюць гэтую пасаду. Ён зазначыў, што максімальная колькасць незанятых штатных пасадаў урачоў-псіхіятраў — у Гомельскай і Мінскай абласцях, а таксама ў Мінску.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

ЧАСТНАЯ ЖИЗНЬ

Некоторые высокопоставленные белорусские чиновники при каждом удобном случае любят повторять, что в оппозиции — все безработные. Например, в конце минувшего года во время своей пресс-конференции председатель КГБ Беларуси Юрий Жадобин заявил, что большинство представителей оппозиции живет на иностранные гранты. И даже привел конкретный пример: мол, "есть отец, который 17 лет нигде не работал, а живет на гранты. А сегодня его сын начинает жить на эти гранты". Правда, фамилию этого оппозиционера шеф ГБ по каким-то лишь ему известным причинам решил не называть.

Совсем недавно и Александр Лукашенко в одном из своих публичных выступлений фактически поручил руководителям белорусских телеканалов показать, как живет оппозиция.

"Народная воля" решила побывать в гостях у самых известных представителей белорусской оппозиции, посмотреть на их квартиры, машины, дачи, а заодно расспросить про "золотые запасы".

Анатолий ЛЕБЕДЬКО:

«Я на самом деле очень богатый человек, и у меня есть серьезный капитал...»

К председателю Объединенной гражданской партии Анатолию Лебедько долго напрашиваться в гости не пришлось. Он сразу назвал адрес и сказал: приезжайте в любое время.

Лебедько живет почти рядом с главой государства. Правда, не в тщательно охраняемом коттедже, а в самой обычной серенькой многоэтажке на улице Леси Украинки.

Когда мы приехали, Анатолия Владимировича дома не оказалось. В квартиру нас впустила его супруга Светлана, которую политик забыл предупредить о непрошеных гостях... Сам Лебедько появился дома примерно через полчаса и сразу присоединился к нашему разговору.

Лифт

В лифте, которым пользуется Анатолий Лебедько, черным цветом старательно выведено "Жыве Беларусь!". Светлана говорит, что, когда увидела эту надпись, на всякий случай поинтересовалась у мужа и сына, не они ли испортили имущество.

"Мы к этому не причастны", — почти в один голос ответили они.

Квартира

У Лебедько трехкомнатная квартира. Общая площадь — около 68 квадратных метров, жилая — примерно 38.

"Мы переехали в Минск в 1990 году, — вспоминает жена Лебедько. — *Толя был депутатом Верховного Совета, а иногородним тогда предоставляли жилплощадь. До этого мы с мужем жили в Ошмянах вместе с моими родителями. И когда в Верховном Совете начали давать квартиры, муж поначалу отказался от жилья в столице. Когда он рассказал об этом, нашему с мамой удивлению не было предела! В конце концов он сдался, и у нас, наконец, появился свой угол. Квартиру мы приватизировали лишь тогда, когда Верховный Совет разогнали.*

Два года назад мы сделали здесь небольшой ремонт. Анатолий Владимирович, правда, в то время был в тюрьме, а мы с сыном ремонтировали зал, коридор и ванную, потому что там плитка уже сыпалась на голову. Дивану этому уже лет десять. А вот стенку заменили. Хотели вообще обойтись без нее, но не получилось".

В зале, кроме стенки и дивана, стоит еще и большой плоскоэкранный телевизор "Филипс".

"Мы купили его пару лет назад с помощью Толиных родителей, — рассказывает Светлана. — *Если не ошибаюсь, стоит он около тысячи долларов. Старый телевизор мы поставили на кухню".*

Комната Артема Лебедько — совсем крохотная. Там, кроме стола и пары полок, еще поместилось кресло-кровать.

В спальне — самые обычные кровать, шкаф и тумбочка. По словам Светланы, пейзаж, который висит напротив их семейного ложа, они с мужем покупали в те времена, когда белорусские художники еще торговали своими работами вдоль теперешнего проспекта Независимости.

"А люстра здесь у нас очень старая, мы ее уже лет пятнадцать хотим заменить, но все руки не доходят, — говорит Светлана. — *Из роскоши тут, пожалуй, только икона, которую Толя лет семь назад привез из Греции".*

Кухня у Лебедько площадью около девяти квадратных метров. В глаза сразу бросается холодильник "Аристон", на котором между двумя мягкими игрушками, гордо стоит бело-красно-белый флаг.

"Микроволновки у нас нет, — признается жена Лебедько. — *Толя отвез ее в партийный офис. Как, впрочем, и кофеварку, и маленький телевизор. Если у меня есть запасы кофе или чая, то все уходит в партию. Я к этому уже привыкла..."*

Пока Лебедько заваривает чай, Светлана рассказывает: *"В семейном плане я счастливый человек. Если Толя не в тюрьме, то каждое утро он готовит мне кофе. Правда, из еды супруг может сделать лишь яичницу, отрезать хлеба и колбасы, ну, и еще разогреть приготовленное. И что такое пылесос взять в руки, Толя тоже не знает. Поэтому мы делим эти обязанности с сыном. Кстати, в отличие от папы, Артем может, если надо, и суп сварить, и мясо поджарить, и макароны приготовить..."*

Не так давно кто-то злобно подшутил над политиком Лебедько — под объявлением о продаже квартиры дали его домашний телефон.

"Звонили без перерыва, — рассказывает Светлана. — *Я сначала отнекивалась, объясняла, что это какая-то ошибка. А потом, не выдержав, стала отвечать: да, мы продаем квартиру, цена — миллион долларов. И добавляла: если вы заплатите нам эту сумму, то мы хоть сегодня освободим жилплощадь. В ответ слышала возмущенное: "Вы с ума сошли!" А мужу объяснила: продав квартиру за такую сумму, мы сразу решим все свои финансовые проблемы..."*

Анатолий и Светлана Лебедько.

Самая обычная многоэтажка.

Телевизор, купленный при помощи родителей.

Спальня.

Загородные дома

По словам Светланы Лебедько, ни дачи, ни загородного дома у них с мужем нет.

"У моих родителей в Ошмянах была городская квартира, а потом они ее продали и переехали в Слуцк — поближе к сестре, — говорит жена Лебедько. — *У нас есть земельный участок, который юридически оформлен на Толю. Я даже точно не могу сказать, сколько там соток — кажется, десять. А может, и меньше. Там его родители садят картошку. Толин отец — кулак в самом хорошем значении этого слова. Как раз на днях мы отмечали его 70-летие. Летом он в три часа уже на ногах, пашет, сеет. Он жадный до работы..."*

"У него всегда было больше земли, чем положено, — подключается к разговору Анатолий Лебедько. — *Он выезжал в лес, выкорчевывал делянки и засевал их. Председатель колхоза обнаруживал их, присылал туда трактор, и все посевы запахивали. А отец был счастлив, что из пяти делянок две запахали, а три остались..."*

"Так что дачи у нас нет, — продолжает Светлана. — *Толя говорит, что в Верховном Совете можно было получить участок под дачу, но тогда нам это было не надо. Мужа часто не бывает дома, а я не хотела, чтобы эта дача висела на мне..."*

"Коронное блюдо" Лебедько — горячий чай.

Счета в банках

Услышав вопрос про счета в зарубежных банках, Светлана развеселилась.

"У меня есть счет в "Беларусбанке" — мне зарплату туда перечисляют", — говорит она.

Кстати, Светлана Лебедько якобы нигде не получает зарплату.

"Я вообще-то исправно плачу налоги и тем самым содержу огромный штат чиновников, — говорит он. — *Мое место работы* работает в школе, преподает английский язык. В месяц зарабатывает примерно 700 тысяч белорусских рублей.

Единственный сын Анатолия Лебедько учится в БГУ на факультете международных отношений.

"Сын учится платно — мы этого никогда не скрывали, — говорит Светлана. — *В год на обучение уходит в среднем около трех миллионов белорусских рублей. Ни на имя Артема, ни на имя родителей счетов в зарубежных банках мы не открывали. Что касается наших родителей, то они живут на пенсию. Мы им, естественно, помогаем. А они при каждой возможности стараются нам подсобить. Так, наверное, в каждой семье".*

"В ближайшие дни я стану обладателем персонального банковского счета, — добавляет Лебедько. — *Мне должны вернуть деньги, которые я платил за штамп на выезд и паспорт".*

Доходы

Анатолий Лебедько разрушил популярный миф о том, что

— Объединенная гражданская партия. Зарплату я, как и некоторые другие члены нашей партии, получаю по ведомости, все проходит официально, без черных схем. Откуда финансирование? У нас существует система пожертвований и взносов. За счет этих средств мы содержим офис и часть рабочего аппарата. Работа у нас начинается в девять утра. Размер моей зарплаты не превышает средней зарплаты по стране и Минску.

Вообще-то, я могу зарабатывать многими своими качествами. Могу читать лекции, давать рекомендации, как вести себя в бизнесе, могу писать статьи..."

"Одно время Толя занимался репетиторством по французскому языку, — добавляет Светлана. — *Это было в тот период, когда мы переживали финансовые сложности..."*

"Сегодня мы, слава Богу, не голодаем и не бедствуем, — говорит Лебедько. — *У нас нормальный средний уровень среднестатистической белорусской семьи..."*

Командировки

Не секрет, что до недавнего времени Анатолий Лебедько довольно часто выезжал за рубеж.

"Практически все командировки были оплачены приглашающей стороной, — говорит Лебедько. — *Долгое время мы с бывшим председателем Палаты представителей Владимиром Коноплевым и другими депутатами ездили в Страсбург на сессии ПАСЕ. Так вот ни за Коноплева, ни за Лебедько белорусский налогоплательщик не платил. Как правило, приглашающая организация закладывает в свой бюджет расходы на твое пребывание за рубежом, особенно если тебя хотят видеть там в качестве докладчика. Бывало, конечно, что и за свой счет приходилось ездить. Тогда, если не хватало своих средств, мы просто искали спонсоров..."*

Машина

В отличие от некоторых чиновников, Лебедько ездит не на новеньком авто.

"У меня "Renault-Scenic" 1998 года выпуска, — говорит он. — *Есть гараж, который находится недалеко от дома".*

"Гараж и машина у меня, — поправляет мужа Светлана. — *А у тебя квартира и земельный участок".*

По словам Лебедько, машину в основном эксплуатирует он сам. Хотя по первому требованию уступает руль супруге.

"Расходы на бензин специально не подсчитываем — ездим на авто, пока есть чем заправлять, — говорит он. — *Если нет — пользуемся общественным транспортом".*

Отдых

"Я предпочитаю зимний отдых: лыжи, экстрим, — рассказывает Анатолий Владимирович. — *После того как мне запретили выезжать из Беларуси, вместе с Валентиной Полевиковой, Александром Добровольским и супругой ездили в Силичи. Когда был выездным, отдыхали на горнолыжных курортах в Чехии и Польше. Как правило, всюду ездили на своем авто".*

"Мы подсчитали, что так получается чуть дешевле, — добавляет Светлана. — *Например, отдых на одном из курортов нам обошелся в 300 долларов, исключая расходы на дорогу и питание. А на море мы за последние годы были дважды. В 1996 году ездили в Сочи. Пару лет назад — в Крым. Ровно на три дня..."*

Капитал

Анатолий Лебедько не скрывает, что он — богатый человек.

"Я действительно очень богатый человек, и у меня есть серьезный капитал, — говорит он. — *Этот капитал — моя семья. Деньги, безусловно, важный элемент, но они уходят, обесцениваются. А капитал семейный самовоспроизводится и самовосстанавливается. Еще у меня есть неплохой политический капитал. Его нельзя измерить в евро или долларах, но он есть. У меня были встречи с Джорджем Бушем, Мадлен Олбрайт, Сильвио Берлускони и другими всемирно известными личностями. Александр Григорьевич, находясь на верхушке власти уже почти четырнадцать лет, сегодня не имеет такого капитала. И в этом мое преимущество..."*

Марина КОКТЫШ.
Фото Юрия ДЕДИНКИНА.

НУ І НУ!

Колькі каштуе падзяка?

За бацькоўскія грошы пачалі купляць сабе ганаровыя граматы выдатнікі шэрагу віцебскіх сярэдніх школ.

Дакладней кажучы, яны купляюць бланкі гэтых пасведчанняў аб сваіх поспехах, а потым атрымліваюць іх, ужо запоўненыя, з рук педагогаў. Пры гэтым і педагогі, і вучні робяць выгляд, што ўсё адбываецца так, як належыць.

Нездарма, відаць, сярод наведвальнікаў фірменнага магазіна віцебскай дзяржаўнай друкарні "Фаліянт" апошнім часам пабольшала школьнікаў. Яны тоўпяцца ля прылаўкаў, выбіраючы на свой густ бланкі ганаровых грамат, каб аднесці іх у школу і атрымаць як узнагароду.

Чым жа тлумачыцца гэта дзіўная сітуацыя? Аказваецца, нішчымніцай нашай адукацыйнай сістэмы, якая змушана эканоміць кожны рубель, не зважаючы на маральныя выдаткі гэтай ашчаднасці.

У шэрагу віцебскіх школ вырашылі перавесці на платную аснову стымуляванне навучэнцаў. Калі вучань варты афіцыйнага заахвочвання, то ў яго два выйсці: альбо ён бярэ ў бацькоў пэўную суму і аддае класнаму кіраўніку, каб той купіў яму грамату, або сам купляе гэты дакумент і прыносіць у школу. Пасля чаго, як той казаў, усе задаволены, усе смяюцца.

Толькі вось нешта не хочацца смяяцца, бо педагогі, эканомячы на кошце грамат, выхоўваюць у дзяцей крывадушша і ўпэўненасць у тым, што ўсё прадаецца і купляецца: сёння — ганаровая грамата, заўтра — атэстат сталасці і нават медаль выдатніка вучобы, а потым — дыплом ВНУ і пасада ў дзяржаўнай структуры...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ПОСТАЦІ

Камень на гару

Уладзіміру Дамашэвічу — 80

...Пачатак 80-х. У Доме літаратара — пісьменніцкі з'езд. Усё ідзе як мае быць, па звыклай завядзёнцы. У прэзідыуме, сярод знаных творцаў, — пільныя ідэалагічныя "пастыры", цэкоўскія бонзы. На трыбуне — дакладчыкі і прамоўцы з традыцыйнымі справаздачамі і заклікамі да майстроў пяра "натхнёна служыць справе пабудовы камунізму, выхавання новай гістарычнай супольнасці — адзіны савецкі народ" і г.д. У зале — сумота, пазяханні, лёгкі шумок ад перашэптаў.

І раптам... Зала ажывілася, адабральна загула — і імгненна змоўкла, ператварыўшыся ў слых: слова ўзяў пісьменнік Уладзімір Дамашэвіч. Пэўна, многія здагадваліся, аб чым ён збіраецца гаварыць: поглядаў сваіх, перакананняў, якія былі не ў дугу афіцыйным установкам, Уладзімір Максімавіч не хаваў. Яшчэ амаль за дваццаць гадоў да гэтага, калі з размахам, пад фанфары адзначаўся паўвекавы юбілей савецкай улады, на сустрэчы з маскоўскімі гасцямі ён адкрыта выказаўся наконт таго, што нарабіла гэтая самая ўлада з душой беларуса, заціснуўшы яе ў абцугі татальнай русіфікацыі, адкінуўшы ад нацыянальнай свядомасці, культуры, гістарычнай памяці.

Гэта было як выбух бомбы... Што тут усчалося! Без усялякага сумневу, дзёрзкаму непаслушэнцу перакрылі б кісларод так, каб і дыхаць не мог. Але выручылі, адвялі ўдар рускія сябры — тады яны зразумелі трывогі беларускага творцы.

І вось зноў — на шырокай публіцы, у прысутнасці высокага начальства... Прамоўцу некалькі разоў перапынялі, нагадваючы пра "рэгламент", а зала выгуквала: "Падоўжыць час! Хай гаворыць!"

І ён гаварыў — спачатку ціхім, глухаватым голасам, які ўсё мацнеў, напаўняўся жывым унутраным агнём прамоўцы. Гаварыў з болем і абурэннем: нават самыя таленавітыя кнігі беларускіх паэтаў і празаікаў выдаюцца неадпаведнымі тыражамі і амаль не даходзяць да тых, каму прызначаны. Хутка іх і зусім не будзе каму чытаць, бо зачыняюцца беларускія школы, родная мова ў сваёй хаце даведзена да стану Папялушкі. А без любові да роднага, без высокай духоўнасці і культуры што ж добрага набудуць "будаўнікі светлага заўтра"? Гаварыў фактычна аб тым, аб чым пісаў яшчэ ў 1956 годзе, у тады невядомым шырокаму грамадству лісце ў ЦК КПБ народны пясняр Якуб Колас у свой апошні дзень жыцця, калі прыйшоў з гэтым лістом у "Чырвоны дом", а яго там не прынялі...



І ў тыя хвіліны Уладзімір Дамашэвіч нібыта адчуваў падтрымку старэйшых настаўнікаў, якіх ужо не было на гэтым свеце, і тагачасных сяброў. Сказаў бы, што думае, і сёння, калі сітуацыя нашмат горшая, і дэмакратычная грамадскасць, нацыянальна свядомая інтэлігенцыя б'е ў званы аб дэбеларусізацыі краіны. А тады, выказваючы тое, што падзялялі, ды не адважваліся сказаць услых хаця б некаторыя ў пісьменніцкім асяродку, трэба было мець сапраўдную грамадзянскую адвагу і адказнасць, творчую і чалавечую годнасць. Яны заўжды ўласцівы гэтаму сціпламу, хударляваму, інтэлігентнаму чалавеку, пра якога тым не менш на момант памятнага выступу можна было сказаць: леў на трыбуне!

Усяго адзін эпізод, а як раскрывае чалавека з душою нязломнага ваяра: за тое, у што верыць, гатовы стаяць да канца.

...Падлеткам ён зведаў ваеннае ліхалецце, і перажытае ім самім, роднымі, землякамі з вёскі Яншычы і наваколля далі штуршок для многіх ягоных твораў, такіх, напрыклад, як "Порахам пахла зямля", "Заклінаю ад кулі", "Між двух агнёў" ці аповесці "Кожны чацвёрты", адзначанай Літаратурнай прэміяй імя І.Мележа. Глыбокі псіхалагізм, пранікненне ў душу героя, трапіўшага ў складаныя перапляценні трагічных падзей, характэры і для ягоных кніг пра вёску, якую празаік добра ведае і пасыноўску любіць. І на ваенную, і на вясковую тэму ў нашай літаратуры напісана мноства твораў, у ёй высока зяюць імёны Васіля Быкава, Алеся Адамовіча, Івана Мележа і іншых магутных валадароў слова. Ды Уладзімір Дамашэвіч нікога не паўтарае, ідзе сваім уласным шляхам, што зусім-зусім не проста. Гэта ўсё роўна, што ўскочваць камень на гару: без упартасці, мужнасці, цярплівасці нічога не атрымаецца. У тым ліку — і напісаць раман "Камень з гары"...

Уладзімір Максімавіч Дамашэвіч — адзін з сённяшніх старэйшын і прыкметных постацяў у нацыянальнай літаратуры, заслужаны работнік культуры Беларусі. — 17 лютага сустрэў сваё 80-годдзе. Час бярэ сваё, але і душа, і пяро пісьменніка не ведаюць спакою. Ён піша новыя мастацкія рэчы, публікуе мемуары. Чытачам "Народнай волі" прапануе публіцыстычны роздум аб пераадоленні заняпаду, у якім апынулася наша вёска. Ён будзе надрукаваны.

Голас яго гучыць глухавата, але ў вачах — ранейшае маладое святло. І ранейшая мужнасць.

З юбілеем, шаноўны Уладзімір Максімавіч! Доўгіх Вам жыццёвых дарог з адметнымі вяхамі на шляху, добрага здароўя і творчых сіл, светлай душэўнай радасці!

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

ТРЫВОЖНА

Туберкулез: усё часцей хварэюць медыкі

У Беларусі існуе праблема заражэння медыцынскага персаналу туберкулёзам, паведаміла на пасяджэнні калегіі Міністэрства аховы здароўя старшыня рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя Алена Бельская. Яна зазначыла, што ў прафсаюзаў "выклікае занепакоенасць захворванне работнікаў аховы здароўя на актыўны туберкулёз".

Паводле яе інфармацыі, у 2007 годзе ўпершыню дыягназ "туберкулёз" быў пастаўлены 91 работніку лячэбна-прафілактычных устаноў Беларусі, 14 з іх — работнікі туберкулёзных дыспансераў. На думку А.Бельскай, неабходна прымаць меры для прадухілення заражэння медыкаў на месцы працы "шляхам паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя, забеспячэння работнікаў аховы здароўя якаснымі сродкамі індывідуальнай абароны і спецадзеннем".

Тым не менш смяротнасць ад гэтай інфекцыі ў цэлым у краіне знізілася на 7%, захворванне — на 5%, паведаміў на калегіі міністр аховы здароўя Васіль Жарко.

"Аднак выклікае занепакоенасць рост смяротнасці і рэцыдыву захворвання на туберкулёз у Гомельскай вобласці. Шмат у чым гэта звязана з недастатковай колькасцю месц у стацыянарах для лячэння туберкулёзу, у тым ліку прымусовага лячэння паводле рашэння суда, немагчымасцю працяглай ізаляцыі хворых з хранічнымі формамі туберкулёзу і пастаянным бактэрыявыдзяленнем", — сказаў міністр.

У Мінскай вобласці наогул адсутнічае аддзяленне для прымусовага лячэння хворых на туберкулёз паводле рашэння суда. "Цяпер прынята рашэнне аб стварэнні ў вобласці стацыянара для лячэння мультырэзістэнтных форм туберкулёзу", — паведаміў В.Жарко.

Алена СПАСЮК.

75!

Калі гады не да бяды...

28 лютага даўні чытач "Народнай волі" Анастас Лявонцьевіч СЕМЯНОВІЧ адзначыў сваё 75-годдзе, а яшчэ ў гэтым годзе адсвяткуе з жонкай "залатое" вяселле.

Гаспадыня, Вера Сідараўна Семяновіч, гасцінна сустракае мяне ў сваім доме ў Бараўлянах разам з аўчаркай Томам.

— Сабачка хоць і агромністы, але вы не палохайцеся, — супакойваюць мяне. — У дом Том усіх пускае, а вось выйсці ўжо праблематычна.

Пакуль гаспадар "на падыходзе", Вера Сідараўна дастае фотаальбом і ўспамінае пра маладыя гады.

— З Анастасам мы пазнаёміліся, калі пасля заканчэння Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі я адправілася на практыку, — распавядае яна. — Муж скончыў Політэхнічны інстытут, абодва мы са Слуцкага раёна, так і пазнаёміліся. Вельмі прыгожы быў хлопец! Мы нейкі час пасля практыкі перапісваліся з ім, а пасля і ажаніліся. Чаго адкладваць справу ў доўгую скрыню? 30 снежня гэтага года адзначым "залатое" вяселле — 50 гадоў спаўняецца, як ажаніліся.

Пасля вяселля маладым давялося нялёгка. Анастас нейкі час вучыўся і працаваў адначасова, яго жонка Вера ўладкавалася ў навукова-даследчы інстытут. Каля 15 гадоў здымалі кватэру, пакуль не набылі свой куточак. У той час Анастас Лявонцьевіч працаваў ужо ў "Белтрансгазе".

— Каля сарака гадоў там і адпрацаваў, — далучаецца да размовы гаспадар. — Нават, калі ўжо на пенсію пайшоў, то некалькі гадоў яшчэ заставаўся на працы, а пасля для сябе вырашыў: хопіць! Надакучыла ўсё, трэба ж і для дзяцей з унукамі пажыць. Тым больш што і дома можна знайсці работы пад завязку. У мяне вось агарод, кур трымаю.

Анастас Лявонцьевіч і на самай справе выглядае яшчэ вельмі маладым і жвавым. Бачна, што ў гэтага чалавека ў руках усё гарыць.

— Нікому не дазваляю займацца гаспадаркай, толькі сам усё раблю, — расказвае суразмоўца. — Пастаянны рух — гэта жыццё. Таму жонцы кажу так: "Ты, даражэнькая, апранайся прыгожа і — на вуліцу. Пагуляй, свежым паветрам падыхай, а я ўсё сам зраблю". Так вось і жывём.

— Не сумна на пенсіі? — цікаўлюся ў гаспадароў.

— Чаму ж сумна? — дзівяцца яны ў адказ. — Дзякуй Богу, двух сыноў-малайцоў выгадавалі, яны нам чатырох унукаў і ўнучку падаравалі. Наведваюць, цешаць старых. А ў вольны час "Народную волю" чытаем. Мы ж яе выпісваем з першага дня, ніводнага нумара не прапусцілі. Дзякуй вам за газету...

Дзякуй і вам, нашы шчырыя чытачы. І — ад шчырага сэрца віншуем!

Алесь СІВЫ.
Фота аўтара.

ЗДАРЭННЕ

Сабаку так і не злавілі

У Гомелі бяздомны сабака напаў на траіх дзяцей і пакусаў іх. Гэта здарылася прыкладна ў 16.00 на вуліцы Мазурава.

Як паведаміў БелаПАН прэс-сакратар абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, на месца здарэння выехалі ратавальнікі, каб злавіць бадзяжнага сабаку, але той уцёк.Паводле інфармацыі Р.Габрылёва, дзеці 10—11 гадоў былі дастаўлены ў паліклініку, дзе ім аказалі медыцынскую дапамогу.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

УСЛУГИ

Прием стеклотары, вторсырья и др., помощь инвалидам, пенсионерам г.Минска. Тел. 8-033-661-11-87.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Не любіш сваё — не палюбіш і чужое

Прэзентацыя "Беларуска-ўкраінскага слоўніка" адбылася падчас сходу грамадскасці ў гонар Міжнароднага дня роднай мовы. У імпрэзе, адкрытай страшынёй ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны" Алегам Трусавым, бралі ўдзел старшыня Камітэта па справах ЮНЕСКА У.Шчасны, Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Украіны ў Рэспубліцы Беларусь У.Ліхавы і іншыя. У зале прысутнічалі прадстаўнікі польскага, шведскага і іншых пасольстваў у нашай краіне.

Вядомыя навукоўцы В.Лемцюгова, І.Савіцкая, Т.Кабржыцкая усхвалявана гаварылі аб ролі родных моў у развіцці ўсебаковых, асабліва духоўных і культурных, стасункаў між народамі, аб вялікім значэнні слоўніка дзвюх блізкіх моў — беларускай і ўкраінскай — ва ўзаемаразуменні, узаемаўзбагачэнні і ўмацаванні шчырай дружбы двух суседніх братэрскіх народаў. Гэтае важкае выданне, выпушчанае ў Кіеве ў межах Дзяржаўнай праграмы "Словники України" — значны ўнёсак у высакародную справу.

Паміж беларусамі і ўкраінцамі, іх майстрамі культуры, уладарамі слова - даўнія і карысныя творчыя сувязі. Мілагучна і спеўна гучалі на імпрэзе ў перакладзе на ўкраінскую мову радкі са славутага шэдэўра Якуба Коласа "Новая зямля" з вуснаў сябра двух пісьменніцкіх саюзаў В.Стралко. Наша знаная пісьменніца Вольга Іпатава чытала свае пераклады на беларускую вершаў братоў-суседзяў. Вядомыя навукоўцы Адам Мальдзіс і Лявон Баршчэўскі парадавалі навіной, прэзентуючы нядаўна выдадзеныя вугорска-беларускі і беларуска-еўрапейскі (з перакладамі нашай мовы на 28 моў кантынента) слоўнікі... Свята роднай мовы прыгожа аздобілі маладыя музыкі з выкананнем уласных і народных песень.

Слова — аснова нацыянальнага духу кожнага народа, неацэнная каштоўнасць. І разам з тым — пасол міру, сяброўства і любові да ўсіх людзей на планеце.

Такое пасланне беларусаў на свяце, якое атрымалася прадстаўнічым і змястоўным, набыло міжнароднае гучанне. Варта толькі пашкадаваць глухіх да ўсяго гэтага. Напярэдадні ўрачыстасці запрашэнні на яе ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны" накіравала ў міністэрствы адукацыі, культуры, інфармацыі, але яны засталіся без адказу. Можа, не дай Бог, там усе адначасна і дружна захварэлі? А мо хутчэй іншае — пераканаўчае пацвярджэнне трапнага назірання: не любіш сваё — не палюбіш і чужое...

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Букет кветак і «Народная воля» — лепшы падарунак на 8 Сакавіка

У гэтыя дні многія мужчыны ламаюць галаву: што падарыць любімым 8 Сакавіка.

Паверце: букет кветак і квіток на "Народную волю" — лепшы падарунак. Чытаючы нашу газету, будуць успамінаць Вас кожны тыдзень, кожны дзень.

Ёсць магчымасць у якасці падарунка зрабіць **перадаплату** за месяц, два, тры — калі ласка! Нават калі Вы пералічыце грошы, скажам, 7 сакавіка, Ваша любімая жанчына атрымае ўсе нумары газеты за месяц: мы тэрмінова дашлём ёй тыя, якія выйдуць напярэдадні.

У чарговы раз нагадваем: для таго каб зрабіць **перадаплату**, Вам трэба завітаць у любы філіял "Беларусбанка" альбо ў любое паштовае аддзяленне і запоўніць бланк, узор якога мы друкуем і на гэты раз. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: **328-63-93** ці **328-68-71**. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна зрабіць перадаплату за ўсё паўгоддзе альбо за пэўны перыяд: месяц, два, тры...

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется обязательно ***печатными буквами*** *и обязательно отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя отч.
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* корп. кв.

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 27.02.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №